Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№186 (28550)

27 ВЕРАСНЯ 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 9–16

Новы адлік святой мясціны

СТАР. 4

Як кінуць курыць?

СТАР. 5

Усе нюансы рэгіянальнай палітыкі

МС

ЦЫТАТА ДНЯ

Георгій ЕЎЧАР, афіцыйны прадстаўнік МУС:

«Сёння міліцыя шукае чалавек 17, і палова з іх адшукваецца больш за 10 сутак. Як паказвае практыка і як лічаць аператыўнікі, шанцаў знайсці гэтых людзей жывымі становіцца з кожным днём менш, але будзем спадзявацца толькі на лепшае. З пачатку года паступіла каля 300 паведамленняў аб зніклых грыбніках і ягадніках. Пры гэтым 70% паведамленняў прыйшлося на верасень. Больш за ўсё людзей згубілася ў лясах Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей. Пераважная большасць з іх — гэта людзі сталага ўзросту, каля 70—80 гадоў. Самай старэйшай была жанчына 1926 года нараджэння ў Бабруйскім раёне».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.09.2017 г.

Долар ЗША	1,9453	▲
Еўра	2,3008	▼
Рас. руб.	0,0338	▲
Укр. грыўня	0,0736	■

ISSN 1990 - 763X

Гарбузовае раздолле

Фота БЕЛТА.

У Людмілы АХРЭМШАВАЙ з вёскі Смаліца Быхаўскага раёна кабачкі і гарбузы растуць на плошчы больш за гектар. Шчыруе сям'я на гэтай плантацыі ўсё лета: па крохкіх раслінах нават мотаблок не пусціш, усё даводзіцца рабіць уручную. Але справа гэта, прызнаецца гаспадыня, выгадная: сёлета з яе вялікага агарода на мясцовы кансервава-гароднінасушыльны камбінат ужо здадзена каля васьмідзесяці тон кабачкоў і плануецца здаць больш за дваццаць тон гарбузоў.

ПАЖАР НА ЧАТЫРОХ КОЛАХ

Як падрыхтаваць аўто да халадоў?

У мінулую нядзелю а пятай гадзіне раніцы на пульт дзяжурнага Астравецкага РАНС паступіў званок. Відавочцы паведамілі пра тое, што на адной з вуліц гарыць аўтамабіль. Калі ратавальнікі прыбылі на месца падзей, машына была поўнасцю ахоплена агнём. Аднаўленню яна не падлягае. Ды і кіроўца моцна пацярпеў — хоць ён і пакінуў кабіну самастойна яшчэ да прыезду пажарных, але атрымаў апёкі 1-й і 2-й ступеняў 30% плошчы паверхні цела. Што менавіта стала прычынай узгарання, зараз высвятляюць эксперты.

А неўзабаве надыдуць халады, і ў многіх аўтаўладальнікаў, асабліва неспрактыкаваных, узнікне лагічнае пытанне — як жа правільна падрыхтаваць «жалезнага каня» да неспрыяльных умоў надвор'я? І тут варта ўзяць за прыклад тое, як гэта робяць самі ратавальнікі, бо ў іх тэхніка мусіць працаваць з мінімальнай колькасцю збояў. Расказаць аб гэтым карэспандэнт «Звязды» папрасіў **начальніка вытворча-тэхнічнага цэнтра Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Генадзя КУЛЬЧЫЦКАГА.**

СТАР. 4

■ Меркаванні

«ЛЁГКІ» МАЛЫ БІЗНЕС?

Якія змены чакаюць індывідуальных прадпрымальнікаў

19 верасня быў падпісаны Указ Прэзідэнта аб пашырэнні спіса відаў дзейнасці, займацца якімі можна без рэгістрацыі ІП. Мы пастараліся разабрацца ў тонкасцях новаўвядзенняў і пагаварылі з тымі, каго гэта закранула асабіста.

Дзеянне Указа распаўсюдзілася на даволі шырокае кола спецыяльнасцяў: кандытараў, дызайнераў, праграмістаў, майстроў у сферы прыгажосці, вытворцаў адзення і абутку з матэрыялаў заказчыка і тых, хто здае жыллё ў кароткатэрміновую арэнду. Акрамя гэтага, у пералік відаў дзейнасці трапілі настройка музычных інструментаў, перацяжка мэблі, рамонт гадзіннікаў і абутку, малярныя, тынкавачныя і шкляныя работы, паклейка шпалераў.

Аднак гэта не значыць, што цяпер усе майстры змогуць працаваць без афармлення і выплаты падаткаў адпаведна. Прасцей будзе з афармленнем дакументаў: па-першае, не трэба рэгістраваць само ІП, па-другое, не трэба будзе падаваць падатковыя дэкларацыі. Дастаткова перад пачаткам месяца, калі вы плануеце ажыццяўляць дзейнасць, падаць заяву ў падатковую інспекцыю і заплаціць адзіны падатак. Для кожнага віду дзейнасці, як і для кожнага рэгіёна краіны памер выплат вызначаецца індывідуальна. Напрыклад, памер адзінага падатку для ІТ-спецыялістаў — ад 55 да 97 рублёў у месяц, а для майстроў ногцевага сэрвісу і цырульнікаў — ад 38 да 116.

Таццяна, кандытар у Гродне:

— Гісторыю майго захаплення выпечкай можна назваць банальнай. Сышла ў дэкрэт, не выходзячы з яго, нарадзіла і другое дзіця. У выніку — дастаткова вострыя недахоп грошай і руцінныя абавязкі, якія вымотваюць. Як і многія іншыя маладыя мамы, «завісала» на тэматычных старонках жанчын з маленькімі дзецьмі. І ў кожнай, акрамя бездакорнай знешнасці, мілага дагледжанага дзіцяці, было яшчэ і захапленне, пра якое яны з зачараваннем расказвалі. Тады падумала: «А чым я горшая?» і пачала шукаць спосаб заробку для сябе. Рукадзелле ніколі не было маім моцным бокам, касметыкай да 30 гадоў я так і не навучылася карыстацца сама, не кажучы ўжо пра тое, каб «рабіць прыгожымі» іншых, а вось мае кулінарныя здольнасці заўсёды выклікалі шчырую, як мне здаецца, пахвалу. Таму стаўку вырашыла зрабіць на іх. Тым больш, што адправіўшы старэйшага сына ў сад, заўважыла, як усе стараюцца адзін аднаго перасягнуць у незвычайнасці смаку і складанасці афармлення торта на дзень нараджэння.

СТАР. 2

«ПАЗНАЁМІЦЬ» ДЗЕЛАВЫЯ КОЛЫ

Прэзідэнт прапанаваў брытанскаму ўраду рэалізаваць сумесныя з Беларуссю праекты

Дыпламатычным адносінам нашай краіны і Вялікабрытаніі сёлета споўнілася 25 гадоў. Нягледзячы на даволі высокі таваразварот — у асноўным, за кошт беларускага экспарту нафтапрадуктаў, палітычныя адносіны развіваюцца даволі марудна. Прынамсі, на гэтым тыдні да нас упершыню за чвэрць стагоддзя прыехаў член брытанскага ўрада. Гэты факт, будзем спадзявацца, стане пераломным у адносінах нашай дзяржавы і Туманнага Альбіёну.

Фота БЕЛТА.

Прыкладна год таму Беларусь наведаў член брытанскай каралеўскай сям'і — прынц Майкл Кенцкі. Відаць, гэта стала пачаткам да паступовага збліжэння краін. Учарашняя сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і дзяржаўнага міністра па справах Еўропы і Амерыкі Міністэрства замежных спраў Вялікабрытаніі Алана Дункана праходзіла ў вельмі дружалюбнай, шчырай атмасферы.

— Вы ведаеце, спадар міністр, пра што я падумаў, ідучы ў гэтую залу на сустрэчу з вамі? Па-першае, нарэшце высокапастаўлены чалавек, член урада вельмі развітой, прасунутай краіны вырашыў прыехаць у Беларусь. Новы, добры знак. А, па-другое, можа, вам гэта не спадабаецца, я падумаў: вельмі шкада, што Вялікабрытанія ў гэты момант сыходзіць з Еўрапейскага Саюза. У нас быў бы добры, надзейны партнёр і сябар у Еўрапейскім Саюзе, які мог бы сказаць праўду пра Беларусь, — адзначыў беларускі лідар у пачатку размовы з дыпламатам.

У гэтым, прызнаўся кіраўнік нашай дзяржавы, адказ на пытанне, чаго ён асабіста чакае ад візіту міністра брытанскага ўрада ў Беларусь.

— Я чакаю, каб вы ўбачылі Беларусь і хоць бы для сябе склалі пэўнае аб'ектыўнае меркаванне пра нашу краіну. Я хачу, каб вы ўбачылі ўсё тое, чаго так доўга «не заўважалі» заходнія палітыкі і дзяржаўныя дзеячы. Для таго, каб больш глыбока вывучыць гэты працэс, каб ён у нас пайшоў, давайце вызначым тры-чатыры пілотныя салідныя праекты — эканамічныя, бо эканоміка — база любых адносін, — і рэалізуем іх.

Сёння ў Вялікабрытаніі дзейнічае тры суб'екты тавараправоднай сеткі айчынных прадпрыемстваў-экспарцёраў — гэта дачынная структура «Беларускай нафтавай кампаніі», прадстаўніцтва авіякампаніі «Белавія» і прадстаўніцтва ўнітарнага прадпрыемства «Адані». Што да брытанскіх інвестыцый у Беларусі, то летась у нашу эканоміку іх было прыцягнута амаль на 1,5 млрд долараў.

— Давайце скажам па-народнаму проста: у Вялікабрытаніі маса вольных грошай, якія павінны быць укладзены ў справу, — прапанаваў Прэзідэнт Беларусі. — Мы створым самыя зручныя і выгадныя ўмовы для бізнесу, і некалькі — два-тры — сумесных прадпрыемстваў пабудуем у Беларусі, якія будуць працаваць на дзве краіны.

Ён звярнуў увагу, што ёсць некаторыя кірункі, якія ўвогуле не вітаюцца ўрадам Вялікабрытаніі для развіцця на сваёй тэрыторыі. У той жа час у Беларусі яны вельмі неабходныя, а прадукцыя гэтых прадпрыемстваў запатрабавана і ў Вялікабрытаніі. Прэзідэнт прапанаваў стварыць вытворчасць такога тыпу ў нашай краіне.

Аляксандр Лукашэнка станоўча ацаніў рашэнне ўрада Вялікабрытаніі перавесці краіну на электрамабілі:

— Я вітаю і апладзіруючу такому рашэнню. Па вашым прыкладзе ў гэтым кірунку і мы вырашылі рухацца і ў гэтым плане шукаем найбольш прасунутых партнёраў. Давайце разам паспрабуем працаваць у Беларусі. Гэта так, наўскідку, у першым набліжэнні. І маса такіх кірункаў, дзе мы можам разам працаваць з вялікай выгадай для вашага і нашага бізнесу. І калі ваш візіт будзе нейкім штуршком у гэтым кірунку, будзем лічыць, што мы нездарма з вамі правялі час і вы нездарма прыехалі ў Беларусь.

Алан Дункан прызнаўся, што вельмі рады быць першым брытанскім міністрам, які наведвае Беларусь. Ён перадаў беларускаму лідару найлепшыя пажаданні ад прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Тэрэзы Мэй і падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за магчымасць асабіста сустрэцца.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

АПОШНІЯ ШТРЫХІ ВАЖНАГА ДЭКРЭТА

Прэзідэнт сустрэўся з першым віцэ-прэм'ерам

У Палацы Незалежнасці адбылася чарговая сустрэча па разглядзе дакументаў, прызваных лібералізаваць айчынную эканоміку. Учора кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Васіля Мацюшэўскага, першага намесніка прэм'ер-міністра.

Разглядаўся адзін з ключавых дакументаў — праект Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб развіцці прадпрымальніцтва», акрамя гэтага, абмяркоўвалася ўдасканаленне парадку ліцэнзавання — па гэтым пытанні падрыхтаваны праект Указа Прэзідэнта.

— У нас і так у гэтым плане, я лічу, нядрэнны парадак, мы вельмі шмат у гэтым кірунку зрабілі, але бізнес, тым не менш, хацеў бы большай свабоды і большых крокаў па зняцці пэўных адміністрацыйных працэдур, — канстатаваў кіраўнік краіны. — Калі жыццё паказвае, што мы недзе можам зрабіць крокі ў гэтым кірунку, іх трэба рабіць. Рабіць, пажадана, своечасова. Не думаю, што мы тут адстаём, але тым не менш.

Гаворачы пра ліцэнзаванне, Аляксандр Лукашэнка заявіў:

— Мы абмяркоўвалі гэту праблему і прыйшлі да высновы, што можам зрабіць крок у кірунку паведамляльнага характару ліцэнзавання, здзяйснення найбольш распаўсюджаных відаў, як вы пішаце, эканамічнай дзейнасці, — у Дэкрэце гэта вырашылі прапісаць.

Наступная тэма, істотная для прадпрымальнікаў, — рознага кшталту патрабаванні для прадпрыемства, памяшкання, дзе знаходзіцца вытворчасць.

— Гэта вельмі важна, і тут я з бізнесменамі цалкам згодны, — мы дамовіліся пра тое, што на ўзроўні Прэзідэнта мы павінны зацвердзіць агульныя патрабаванні пажарнай бяспекі, санітарна-эпідэміялагічных нормаў, аховы навакольнага асяроддзя... Гэтыя патрабаванні надзвычай аб'ёмныя, непатрэбныя ў сваёй большасці, вельмі напружваюць бізнес і адцягваюць яго ад канкрэтных рашэнняў, задач. Гэтымі дакументамі мы зацвярджаем практычны пералік такіх патрабаванняў, і ўжо розныя адміністрацыйныя перапоны скарачаюцца, — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што бізнесмены ставілі пытанне па стабільнасці падаткаў для бізнесу. Прапануецца замацаваць да 2020 года норму, што новыя падаткі ў нас не з'явяцца і стаўкі па падатках змяняцца не будуць.

— Думаю, на гэта трэба пайсці, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Паглядзім, што ў нас з гэтага атрымаецца. Іншыя патрабаванні, у тым ліку ліквідацыя адміністрацыйных бар'ераў, каб тыя, хто хоча займацца бізнесам, адкрыць бізнес, маглі зрабіць гэта, ну, дапусцім, не за год-паўтара, як часта бывала ў нас, а літаральна адразу або на працягу месяца, каб ніякіх бюракратычных затрымак не было, — мы таксама замацоўваем гэта ў дакументах.

Прэзідэнт нагадаў, што была дамова зацвердзіць парадак ліцэнзавання. Акрамя гэтага, адмяняюцца ліцэнзіі на некаторыя віды дзейнасці. На думку кіраўніка дзяржавы, такое цалкам магчыма прыняць. Беларускі лідар папрасіў Васіля Мацюшэўскага больш падрабязна далажыць пра замацаванне выключнага права суда сваім рашэннем спыняць дзеянне ліцэнзіі або ануляваць яе:

— Каб мы, зноў жа, не перагружалі суды, і каб мы функцыі несудовых органаў улады не перакідвалі на іх.

Аляксандр Лукашэнка аргументаваў гэта тым, што, калі ён слухае даклады кіраўнікоў судоў, яны не патрабуюць згаданую норму аддаць на водкуп толькі судам.

Прэзідэнт таксама пацікавіўся, якія змены адбыліся ў абмяркоўваемых дакументах пасля жнівеньскай нарады.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

У тэму

Васіль МАЦЮШЭЎСКІ, першы намеснік прэм'ер-міністра, паведаміў, што пакет дакументаў па разняволенні дзелавой ініцыятывы быў падрыхтаваны сумесна з бізнес-супольнасцю. Яго адзіная задача — змяніць характар бізнес-асяроддзя, максімальна знізіць адміністрацыйны ўплыў на яго. Што да забароны ўводзіць новыя падаткі да 2020 года, прадугледжанай праектам Дэкрэта, то распрацоўшчыкі ўсяго пакета дакументаў па лібералізацыі бізнесу выступаюць за нязменнасць базавых пасылаў.

— Любы цыкл бізнес-планавання — гэта нават не пяць гадоў, як сяроднетэрміновая перспектыва. Доўгатэрміновая перспектыва — 10—15 гадоў. Адпаведна, усе ўмовы павінны быць прагназуемымі для прадпрымальніка, — упэўнены першы намеснік прэм'ер-міністра.

«ЛЁГКІ» МАЛЫ БІЗНЕС?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Асвойваць выраб тартоў я пачала па тэматычных відэа ў інтэрнэце. І першае расчараванне, якое мяне спасцігла, — для добрых вырабаў патрэбныя дарагія інгрэдыенты. Пра ўпрыгожванні я ўжо маўчу. Пры гэтым «касмічную» цану за торт не паставіш, бо ёсць вопытныя канкурэнты, у якіх танней. Так што сапраўды прыбытковым бізнес можа стаць толькі калі паставіць яго на паток. А так ёсць рызыка працаваць сабе ў страту: выкарыстоўваецца толькі частка нятанных прадуктаў, і да наступнай замовы яны паспяваюць сапсавацца. Пакупнікоў у мяне не было доўга, таму першы час тарты я выкарыстоўвала ў якасці падарункаў сваім знаёмым. Але паступова «сарафаннае радыё» пачало працаваць, і ў мяне з'явіліся замовы. І ўсё ж не так шмат — кліенцкую базу трэба пастаянна пашыраць.

І тут узнікае вялікае «але». Згодна з заканадаўствам прадаваць кандытарскія вырабы праз інтэрнэт нельга, рэкламаваць іх можна толькі ў тым выпадку, калі ёсць стацыянарны магазін. Вы ўяўляеце сабе, пра якія грошы ідзе гаворка! З'явіўся новы Указ, але нам па-ранейшаму можна прадаваць свае вырабы толькі на рынках ці ў адмыслова вызначаных месцах. Але каму мае вырабы патрэбныя на рынку, я ж працую толькі пад заказ! Да таго ж, гэта пэўная культура пакупак: адна справа замовіць торт у Instagram, а зусім іншая — купіць на адкрытым гандлёвым радзе. Таму канкрэтна для нас, кандытараў, трэба ў першую чаргу змяняць не спосабы аплаты падаткаў, а законныя варыянты ажыццяўлення дзейнасці. Таму што, стоячы на рынку, я зараблю нуль і адпаведна заплачу нуль ў казну і як ІП, і як фізічная асоба.

Адэля, графічны дызайнер у Мінску:

— Я доўга прапрацавала ў буйной кампаніі, але потым зразумела, што мне стала занадта цесна ў гэтых межах, да таго ж жорсткі графік перашкаджаў удзяляць дастаткова часу сям'і, таму я звольнілася. Мне здаецца, я ўжо не ў тым узросце, каб спрабаваць хітрыць і хавацца ад падатковай, таму як законапаслухмяны грамадзянін вырашыла адкрыць ІП. Не скажу, што гэта нерэальна складана, але ёсць пэўныя нюансы, так што зрабіць усё «за адзін дзень», вядома, не атрымалася. Як індывідуальны прадпрымальнік я працую ўжо каля пяці гадоў, тым не менш адназначна пракаментаваць сітуацыю з новым Указам не магу.

Мне здаецца, афармляць ІП ці не афармляць павінна залежаць не ад віду дзейнасці, а ад аб'ёму прадастаўляемых паслуг, таму для кагосьці новая магчымасць можа стаць вельмі выгаднай (у любым выпадку менш галаўнога болю з паперамі), а для кагосьці, у каго пакуль зусім маленькая справа, — усё ж не зусім зручнай.

Пакуль я не разумею што рабіць, у цэлым сістэма работы ўжо наладжана, таму, думаю, вазьму на роздумы сабе некалькі месяцаў. Тым больш, што я збіралася наняць памочніцу, а як фізічная асоба аформіць гэта, як я разумею, не змагу.

Вадзім, цырульнік у Мінску:

— Ужо некалькі месяцаў я знаходжуся ў статусе беспрацоўнага, да гэтага змяніў каля дзясятка салонаў — усё ж такі амбіцыйнаму мужчыну няпроста прыжыцца ў жаночым калектыве, да таго ж у мяне ёсць пэўныя праблемы са здароўем, з-за якіх прыходзілася часта браць бальнічны. Таму нядаўна я пачаў задумвацца пра тое, каб працаваць на сябе. І скажу шчыра, новы Указ мне толькі на руку. Пакуль не разабраўся ва ўсіх нюансах выплаты падаткаў, але скажу, што адназначная перавага — гэта тое, што можна будзе самастойна вырашаць: выплачваць унёскі ў ФСАН ці не і ў якім памеры. Я, напрыклад, аддаю перавагу платнай медыцыне — звяртацца даводзіцца часта, і ў пенсійны перыяд мне таксама хацелася б карыстацца ёю, думаю, змагу цалкам рацыянальна распарадзіцца сваімі грашыма.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

■ Добрая навіна

Грошы для музея

Кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў рашэнне савета фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы культуры і мастацтва аб выдзяленні больш чым 598 тысяч рублёў на завяршэнне сёлета капітальнага рамонту музея В. К. Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве — філіяла Нацыянальнага мастацкага музея. У справу будзе ўкладзена больш чым 470 тысяч рублёў з рэспубліканскага бюджэту і каля 127 тысяч адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць.

Музей размешчаны ў сценах помніка архітэктуры канца XVII стагоддзя і з 2013 года знаходзіцца на рэканструкцыі. Праектам прадугледжваўся капітальны рамонт пабудовы, устаноўка сучаснага мультымедыйнага абсталявання і сістэмы клімат-кантролю. Планавалася захаваць экспазіцыйны рад мастацкай спадчыны майстра і мемарыяльны раздзел, зрабіўшы акцэнт на інтэрактыўнасці і новых музейных тэхналогіях. Былі спадзяванні, што ў абноўленым выглядзе музей адкрыецца яшчэ ў 2016 годзе, але на той момант не хапіла сродкаў. Музей В. К. Бялыніцкага-Бірулі з'яўляецца першым ў Беларусі мемарыяльным музеем, прысвечаным жыццю і творчасці мастака. Да рамонту тут захоўваліся ўнікальныя экспанаты, перададзеныя ўдавой Бялыніцкага-Бірулі Аленай Аляксееўнай — асабістыя рэчы з сядзібы «Чайка» ў Цвярской вобласці, дзе была дача мастака, эцюднік, пэндзлі, палітра, паляўнічая стрэльба, мэбля, зробленая ў Абрамцаўскай майстэрні, фотаархіў і дакументы, у тым ліку лісты Ільі Рэпіна, карціны і эцюды майстра.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ На слыху

«ПОШУКІ ХЛОПЧЫКА БУДУЦЬ ПРАЦЯГВАЦЦА»

У Белавежскай пушчы па-ранейшаму вялікая колькасць людзей задзейнічана ў пошуках 10-гадовага хлопчыка — жыхара аграгарадка Новы Двор Свіслацкага раёна, які ў суботу 16 верасня выправіўся ў лес у грыбы і не вярнуўся дадому.

— Пошукі з таго моманту не спыняюцца. Колькасць міліцыянераў, вайскоўцаў, ратавальнікаў, прадстаўнікоў арганізацый, прадпрыемстваў, валанцёраў пошукава-ратавальных атрадаў, добраахвотнікаў стабільна высокая, — паведаміў «Звяздзе» намеснік старшыні па сацыяльных пытаннях Свіслацкага райвыканкама Юрый Кулікоў. — Цяпер яны вядуць пошукі больш кропкава, паколькі асноўныя напрамкі ўжо неаднаразова адпрацаваныя. Найперш гаворка пра цяжкадаступныя месцы, дзе можа знаходзіцца хлопчык. Працаваць у такіх кропках могуць толькі падрыхтаваныя людзі, а не звычайныя добраахвотнікі. Да таго ж кола пошукаў звужаецца. На жаль, свежай інфармацыі няма: хлопчык пакуль не знойдзены... Але аперацыя будзе працягвацца.

Як дадалі ў раённым аддзеле па надзвычайных сітуацыях, у панядзелак у пошуках брала ўдзел каля 500 чалавек, у аўторак — каля 350. Нагадаем, у мінулыя выхадныя, як паведамлялася, у аперацыі ўдзельнічала да дзвюх тысяч чалавек. Што датычыцца лятальных апаратаў, дык у панядзелак яны яшчэ былі задзейнічаны, а ў аўторак — ужо не. Звязана гэта з тым, што імі адпрацаваны ўсе магчымыя месцы, якія можна і трэба было правяраць.

Між тым Следчы камітэт распачаў крымінальную справу па факце знікнення дзесяцігадовага Максіма Мархалюка ў Свіслацкім раёне. Пра гэта ўчора журналістам паведаміў старшыня СК Іван Наскевіч. «Мы распачалі крымінальную справу ў адпаведнасці з артыкулам 167 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса», — сказаў ён і растлумачыў, што калі на працягу 10 дзён пасля афіцыйнай заявы аб невядомым знікненні месцазнаходжанне асобы не ўстаноўлена, то частка 2 артыкула 167 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса дазваляе прыняць рашэнне аб завядзенні крымінальнай справы па факце невядомага знікнення.

Як сказаў Іван Наскевіч, сёння няма інфармацыі, што зніклае ў Свіслацкім раёне дзіця стала ахвярай злачынства. «У той час як уся грамадскасць, людзі спадзяюцца, што хлопчык яшчэ жывы, што ён, напэўна, заблукаў, чакае дзесьці дапамогі, заводзіць справу па факце забойства было б нават амаральна. Не кажучы пра тое, што незаконна», — дадаў ён.

У прэс-службе УУС Гродзенскага аблвыканкама таксама акцэнтавалі ўвагу на недапушчальнасці распаўсюджвання чутак пра тое, што хлопчыка бачылі ці ён нібыта знойдзены. Дэзынфармацыя толькі шкодзіць пошукавым мерапрыемствам. Па поўную і дакладную інфармацыю варта звяртацца да афіцыйных крыніц.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

Таму што яна — з народам

...Газеце сто гадоў? Я ж помню яе куды маладзейшай. Мой бацька заўсёды выпісваў «Звязду». Селянін, здавалася б, не было калі пот выцерці, амаль непісьменны, а газету праглядаў кожны вечар. Нешта нам, шасцярым сваім дзецям ды жонцы Марыі, пераказваў.

І потым нумары яе не выкідваў — пускаў на так званыя самакруткі. Табаку, самасад курыў, патрэбнай паперы не набярэшся, а старыя газеты заўжды пад рукой.

Той, пасляваеннай «Звяздой», мы абклейвалі і новую хату. Выглядала вельмі ўрачыста, бо амаль з кожнай старонкі пазіраў на нас генералісімус Сталін. Мы яго крыху пабойваліся і вельмі паважалі...

Потым, падросшы, чытаць «Звязду» ўжо браўся я сам. І мае першыя публікацыі былі менавіта ў гэтай любімай газеце. Помню, як не мог дачакацца паштальёна, каб разгарнуць свежы нумар, убачыць свае нататкі.

...Табе, «Звязда», сто гадоў? Мне таксама націкала ўжо нямала. Калі перабіраць у памяці здабыткі, імёны сяброў, то я ў гэты спіс уношу і цябе. Чаму? Ды таму, што ты ніколі не здраджвала мове, на якой гаварылі мае землякі і з якой я сам узняўся ў людзі, таму, што ты заўсёды была ў гушчы падзей — сваіх і замежных, таму, што ты заўсёды з народам: аберагала і аберагаеш яго традыцыі і звычаі, яго мудрасць. Вось за гэта — асобны дзякуй!

А што пажадаць табе на заўтрашні дзень? Быць цікавай! Быць найлепшай сярод іншых газет! Хай сябруюць з табой і старыя, і маладыя! Шукаць у сённяшняй яве самае прыемнае і ўзнёслае, умець радаваць ім сучаснікаў, а таксама беражліва шанаваць тых, хто ўсім сэрцам любіць цябе.

Уладзімір Ліпскі,
лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

P.S. *Тыя, хто ўсім сэрцам любіць «Звязду», на газету, вядома ж, даўно падпісаліся: ім пра гэта нагадваць не трэба. І ўсё ж...*

Калі вы з нейкіх прычын не змаглі, не паспелі завітаць на пошту ці ў шапікі «Белсаюздруку» і аформіць падпіску, сёння-заўтра яшчэ можна гэта зрабіць: хутчэй за ўсё вам пойдуць насустрач, вы будзеце жыць са «Звяздой», а ваша «Звязда» — з вамі.

■ Год навукі

Нацыянальная філасофія ў глабальным свеце

Першы беларускі філасофскі кангрэс пройдзе 18—20 кастрычніка ў Мінску

Ён стане найбуйнейшым у гісторыі нашай краіны навуковым форумам у галіне філасофіі, сацыяльных і гуманітарных навук, этапным мерапрыемствам у рамках Года навукі.

Удзел у ім возьмуць звыш 500 беларускіх навукоўцаў, выкладчыкаў, аспірантаў, прадстаўнікоў экспертных колаў з Беларусі, краін ЕАЭС, дзяржаў Еўропы, Азіі і Амерыкі. Сярод гасцей кангрэса — кіраўнікі міжнародных навуковых арганізацый і фондаў, лідары нацыянальных філасофскіх школ шэрагу краін свету.

Арганізатары разглядаюць кангрэс як інструмент кансалідацыі навукоўцаў краіны вакол вырашэння карэнных задач развіцця дзяржавы, грамадства і культуры, а таксама як сродак наглядной дэманстрацыі дасягненняў беларускай навукі, спадчыны айчыннай духоўнай культуры, інтэлектуальнага патэнцыялу Беларусі, укладу краіны ў мірны працэс і вырашэнне глабальных праблем сучаснасці.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Жыхары Іракскага Курдыстана прагаласавалі за незалежнасць

Больш за 93 працэнты ўдзельнікаў рэферэндуму ў Іракскім Курдыстане падтрымалі ідэю незалежнасці рэгіёна, сведчаць даныя падліку 282 тысяч галасоў (каля дзевяці працэнтаў тых, хто прагаласаваў). Пра гэта РІА Навіны расказалі ў Вышэйшай незалежнай камісіі па рэферэндуме і выбараў у Курдыстане. Супраць незалежнасці прагаласавалі 6,71 працэнта выбаршчыкаў. Старшыня камісіі адзначыў, што вынікі могуць мяняцца, паколькі падлік працягваецца. Афіцыйныя вынікі абвесцяць у чацвер. У рэферэндуме ўдзельнічала каля 3,3 мільёна чалавек, яўка склала 72,16 працэнта. Супраць рэферэндуму выступіў афіцыйны Багдад, а таксама ЗША і ААН. Турцыя і Іран пачалі вучэнні на мяжы з рэгіёнам, а Іран закрыў сваё неба для авіязносін.

У Японіі пройдуць датэрміновыя выбары ў парламент

Прэм'ер-міністр Японіі прыняў рашэнне аб правядзенні ў краіне датэрміновых парламенцкіх выбараў — паводле яго слоў, з-за нарастаючай пагрозы з боку КНДР. Сіндза Абэ заявіў, што ніжняя палата парламента будзе распушчана. За кошт пазачарговага галасавання, якое адбудзецца 22 кастрычніка, прэм'ер спадзяецца захаваць пазіцыі кіруючай Ліберальна-дэмакратычнай партыі. «Пагрозы з боку Паўночнай Карэі не паўплываюць на выбары, якія з'яўляюцца асновай дэмакратыі. Я ўпэўнены, што мы павінны правесці датэрміновае галасаванне і заручыцца падтрымкай грамадскасці, каб прымаць меры супраць такіх пагроз», — сказаў кіраўнік японскага ўрада.

М'янма адхіляе абвінавачванні ў генацыдзе рахінджа

Колькасць бежанцаў народнасці рахінджа, якія пакінулі М'янму і накіраваліся ў суседнюю Бангладэш, дасягнула 436 тысяч. Такія звесткі прывяло Упраўленне ААН па справах бежанцаў. Раней генеральны сакратар сусветнай арганізацыі Антоніу Гутэрыш прызнаў, што ў дачыненні да рахінджа праводзяцца этнічныя чысткі. Улады М'янмы гэта адмаўляюць. «Ні этнічных чыстак, ні генацыду ў нашай краіне няма», — сказаў на пасяджэнні генеральнай асамблеі ААН пастаянны прадстаўнік М'янмы пры ААН Хо До Сюань.

Цераз Атлантыку працягнулі наймагутны інтэрнэт-кабель



Карпарацыі Microsoft і Facebook, а таксама тэлекамунікацыйная кампанія Telxius афіцыйна абвясцілі аб завяршэнні пракладкі самага магутнага падводнага оптавалаконнага інтэрнэт-кабелю цераз Атлантычны акіян. Канал, які злучыў горад Вірджынія-Біч на ўсходнім узбярэжжы ЗША з іспанскім Більбаа, здольны прапускаць да 160 тэрабіт даных у секунду, што эквівалентна адначасовай трансляцыі 71 млн відэаролікаў у HD-якасці. Гэта ў 16 млн разоў больш, чым сярэдняя хуткасць дамашняга інтэрнэт-злучэння. Даўжыня кабелю складае 6600 кіламетраў, а агульная вага — больш за 4,6 тысячы тон.

■ Чулі?

БАЛЕЛЬШЧЫКІ СУПРАЦЬ ТАКОГА ФУТБОЛА

Міністэрства спорту і турызму адрэагавала на петыцыю аматараў спорту і агучыла свае рэкамендацыі

Спартыўнае ведамства лічыць мэтазгодным скараціць колькасць камандаў, якія выступаюць у вышэйшай лізе футбольнага чэмпіянату краіны, з 16 да 12.

Такая рэкамендацыя ў адрас федэрацыі футбола Беларусі змяшчаецца ў адказе Мінспорта на зварот балельшчыкаў аб скарачэнні дзяржфінансавання футбольных камандаў. Нагадаем, на стыку жніўня і верасня ў кваліфікацыі чэмпіянату свету 2018 зборная Беларусі пацярпела паражэнні ад Люксембурга і Швецыі, такім чынам апусціўшыся на апошняе месца ў сваёй адборачнай групе «А».

Пасля гэтага балельшчыкі стварылі петыцыю, у якой гаварылася: «У сувязі з пастаяннымі няўдалымі выступленнямі нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе ў адборачных турнірах да чэмпіянатаў свету 2010, 2014, 2018 і Еўропы 2008, 2012, 2016, няўдалым выступленнем маладзёжнай зборнай Беларусі па футболе ў адборачных турнірах да чэмпіянатаў Еўропы 2013, 2015, 2017 гадоў, адсутнасцю пастаяннага ўдзелу некалькіх футбольных клубаў з чэмпіянату Беларусі па футболе ў групавых этапах розыгрышаў еўрапейскіх клубных турніраў (Ліга чэмпіёнаў УЕФА, Ліга Еўропы), падзеннем цікавасці гледачоў да прафесійнага футбола ў Рэспубліцы Беларусь неабходна прызнаць існуючую сістэму падтрымкі прафесійных клубаў і падрыхтоўкі прафесійных футбалістаў у краіне неэфектыўнай і спыніць аказанне дзяржаўнай падтрымкі прафесійнаму футболу ў Рэспубліцы Беларусь пры адсутнасці спартыўных вынікаў».

У Міністэрстве спорту і турызму адзначылі, што ў 2016 годзе дзяржаўную падтрымку атрымлівалі 25 клубаў вышэйшай і першай ліг нацыянальнага чэмпіянату. У параўнанні з мінулымі гадамі сума дзяржфінансавання значна скарацілася, — у мінулым годзе яна склала ўсяго 6,5%, а ў 2010-м было 21,8%. Цяпер асноўнымі крыніцамі фінансавання клубаў з'яўляецца падтрымка міжнародных спартыўных структур (36%) і ўласныя даходы (31,4%). Мінспорта таксама адзначае, што ў сувязі з нізкімі вынікамі футбольных зборных Беларусі на міжнароднай арэне аб'ём іх фінансавання ў 2017 годзе зніжаны на 16,7%. Акрамя таго, з бягучага года зарплата футбалістам першай і другой ліг чэмпіянату краіны за кошт дзяржпадтрымкі не выплачваецца. А ў сувязі са зніжэннем цікавасці гледачоў да беларускага футбола ў Мінспорце лічаць мэтазгодным з 2018 года фарміраваць вышэйшую лігу чэмпіянату краіны ў складзе не больш як 12 камандаў, што скароціць дзяржаўныя выдаткі. Адпаведныя рэкамендацыі накіраваны ў асацыяцыю «Беларуская федэрацыя футбола».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

■ Справы духоўныя

НОВЫ АДЛІК СВЯТОЙ МЯСЦІНЫ

25 гадоў таму ў Гродне быў адроджаны Свята-Раство-Багародзічны стаўрапігіяльны жаночы праваслаўны манастыр

Урачыстую літургію ў гонар гэтай даты ўзначаліў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ПАВЕЛ, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. А напярэдадні тут сустрэлі цудадзейную святыню — спіс іконы Жыровіцкай Божай Маці, які прыбыў з Жыровіцкага манастыра.

Хоць манастырскі комплекс і знаходзіцца сярод мноства старажытных будынкаў старога Гродна, яго воблік не зблытаеш з іншымі з-за чорнага купала, на якім зіхацяць жоўтыя металічныя зоркі. Гэты купал бачна здалёк. Такім ён стаў ужо ў перыяд аднаўлення манастыра.

У гонар яго вяртання ў Беларускай праваслаўнай царкве ў пачатку ліпеня 1992 года прайшло першае богаслужэнне і хрэсны ход. Здзейсніў урачыстую літургію Мітрапаліт Мінскі Філарэт, які зараз з'яўляецца ганаровым Патрыяршым Экзархам.

Сёлета юбілейныя ўрачыстасці прымеркавалі да свята Раства Прасвятой Багародзіцы. Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі паведаміў журналістам, што сёстры манастыра не толькі захавалі, але і развіваюць, упрыгожваюць святыню. І цяпер гэта не толькі гістарычны і архітэктурны помнік, але і жывы царкоўны арганізм.

Ігумення ГАЎРЫІЛА звяртае ўвагу яшчэ на адну значную акалічнасць — у пачатку будучага года споўніцца 175 гадоў, як жаночы манастыр з уніяцкага ператварыўся ў праваслаўны. Тады ж пачалася яго перабудова па праваслаўных канонах. Цяпер будуецца царква ў гонар Сяргея Раданежскага, а таксама гаспадарчыя карпусы. Расце і колькасць насельніц. Падчас Першай сусветнай вайны іх колькасць дасягала 500.

Насельніц не аднойчы перавозілі ў іншыя манастыры, аднак, Гродзенскі доўгі час заставаўся дзеючым. Рашэнне аб закрыцці манастыра было прынята ў 1959 годзе, а ў 1960-м насельніц пад наглядам шматлікіх пастоў міліцыі пачалі высяляць. Іх перавезлі ў Жыровіцкі мужчынскі манастыр. З апусцелым будынкам гарадскія ўлады ніяк не маглі вызначыцца: то аддавалі яго студэнтам-медыкам пад інтэрнат, то абласному камітэту ДТСААФ, і нарэшце, па іроніі лёсу, тут размясціўся Рэспубліканскі музей атэізму. І гэта, як ні парадаксальна, выратавала комплекс ад заняпаду. Пастарэлыя будынкі пачалі прыводзіць у належны стан, прычым работы па рэстаўрацыі вяліся згодна з гістарычным і архітэктурным статусам, што адбывалася далёка не ўсюды. У гэты час на тэрыторыі манастыра знайшлі рэшткі старажытнай царквы XII стагоддзя. Храм быў пабудаваны на Замкавай гары майстрамі гродзенскай архітэктурнай школы ў гонар Багародзіцы і стаў галоўным праваслаўным храмам горада. Такім чынам, манастыр знаходзіцца на адным з самых намоленых месцаў, і гэту традыцыю працягвае па сённяшні дзень. Цяпер тут пражывае 16 насельніц, поўнасцю адноўлена манаскае жыццё, кругласутачна чытаецца «неусыпаемы псалтыр».

З першага дня адноўленага манастыра яго ігуменняй з'яўляецца матушка Гаўрыіла (Марыя Глухава).

— Матушка Гаўрыіла, як манастыру ўдаецца ўпісвацца ў жыццё горада?

— Мы ўзнавілі ў першую чаргу аблічча храма, каб прыхаджане маглі атрымаць заспакаенне сваёй мяцежнай душы, духоўнае падмацаванне, падтрымку. А дапамога прыходзіць праз святыя таінствы — прычасце, сабараванне, малітвы. Мы вядзём дабрачынную дзейнасць, не прапускаем ніводнае свята, падзею. Дапамагаем і на Раство, і на Вялікдзень, і на Масленіцу, і на свята Пятра і Фяўроны — у Дзень сям'і і вернасці, і на Пакроў — у Дзень маці.

— Вы з'яўляецеся лаўрэатам прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне». Якую ролю адыгрывае гэта званне ў вашым служэнні?

— Званне абавязвае. І я для сябе вызначыла галоўнае — не спыняцца. Бо калі спынішся, то і жыццё заканчваецца, таму што ўсё жыцце — гэта рух.

— Ці вядзе манастыр гаспадарчую дзейнасць?

— У нас ёсць участак у 3,2 га непадалёку ад Гродна, дзе мы працуем, забяспечваем сябе гароднінай і дапамагаем іншым. Вялікі надзел няма магчымасці трымаць, таму што не хапае рук — у нас усяго 16 насельніц. Але нямала прыхаджан, якія нам дапамагаюць.

— Хто можа стаць насельніцай манастыра? Ці атрымоўваюць гэтыя жанчыны тое, што шукаюць?

— Стаць насельніцай можа любая праваслаўная хрысціянка, якая хоча выратаваць сябе, сваіх блізкіх. Але гэта няпроста і патрабуе столькі працы, што значна лягчэй звярнуць снежную груду, разгрузіць грузавік, чым адзін дзень пражыць у манастыры. Гэта вялікая праца над сабой, над сваім самалюбствам, сваім «я». Трэба поўнасцю аддаваць сябе Богу, адсячы ва ўсім сваю волю, слухаць ва ўсім ігуменню і старэйшых манахіняў. Гэта не кожнаму пад сілу, таму зараз мала ахвотных ісці ў манастыр. Але тыя, хто падыходзіць да гэтага выбару свядома, шчыра, яны атрымоўваюць тое, што шукаюць...

— Якая карысць грамадству ад манаскага послуху?

— Вы прыйшлі ў храм, ідзяце да цудадзейных ікон, гутарыце са святаром, з манахінямі. Калі вы атрымоўваеце духоўнае суцяшэнне, радасць, значыць, вы не дарма прыйшлі ў святую мясціну, вы знайшлі аддушыну. Да пустога калодзежа людзі не ходзяць.

— Ведаю, што манастыр не стаіць убаку ад грамадскага жыцця. Як ідзе ўзаемадзеянне са свецкімі структурамі?

— Мы падтрымліваем дзяржаву, асабліва ў выхаванні новага пакалення. Стараемся, каб дзецям прывіваліся асновы духоўнасці, маральнасці, каб яны выконвалі Божыя запаветы. Галоўным запаветам, лічу, павінна быць шанаванне бацькоў. Тады дзеці не будуць і настаўнікам грубіць, і старэйшым людзям, будуць паважаць сваіх аднагодкаў. Гэта мы стараемся прывіваць і нашым вучням нядзельнай школы, і маладзёжнай групе «Міраносіцы».

Маргарыта УШКЕВІЧ.
margo@zviazda.by

ПАЖАР НА ЧАТЫРОХ КОЛАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Эксплуатацыя пры адмоўных тэмпературах мае свае асаблівасці. У першую чаргу трэба замяніць летнія шыны на зімовыя. Правілы дарожнага руху рэгламентуюць перыяд эксплуатацыі абодвух тыпаў колаў легкавога транспарту. Зімовая гума абавязковая з 1 снежня па 1 сакавіка. Але цягнуць з гэтым не варта. Пачынаць замену летніх шын на зімовыя трэба пры тэмпературы плюс 5—7 градусаў. Справа ў тым, што абедзве гумы адрозніваюцца не толькі малюнкам пратэктара, але і саставам. Летняя шына пры тэмпературы 5—7 градусаў, як кажуць у народзе, «дубее». І яна не выконвае ўсе неабходныя функцыі па счапленні з дарожным пакрыццём. Што нельга сказаць пра шыну зімовую.

Праверце і вадкасць у сістэме ахаладжэння. Трэба высветліць, пры якой тэмпературы замярзае антыфрыз або тасол. Для гэтага ёсць неабходныя апараты. У беларускіх кліматычных умовах трэба, каб пункт замярзання знаходзіўся ў раёне мінус 40 градусаў па Цэльсіі. Ва ўсіх крамах і на запраўках прадаецца такі антыфрыз.

Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць крыніцы электрычнасці — акумулятарнай батарэі. Трэба яе максімальна падзарадзіць, праверыць узровень электраліту і пачысціць клемы ад вокісу. Я б парэкамендаваў правесці замену масла. Ва ўмовах паніжаных тэмператур яго вязкасць павялічваецца, што адмоўна адбіваецца на завядзенні рухавіка. Падрабязную інфармацыю пра гэта дае завод-вытворца. Заліце абмывальнік для таго, каб ачыстка шкла пры нізкіх тэмпературах была магчымая. Некаторыя аўтамабілісты жадаюць крыху сэканоміць грошай і даліваюць туды ваду. І вось так вадкасць замярзае ўжо не пры мінус 30, а пры мінус 5. Таксама варта змазаць усе дзвярныя замкі спецыяльнымі аэразолямі, якія выцясняюць вільгаць. Праверце тармазную сістэму на герметычнасць. У пнеўматычных прыводах пры нізкіх тэмпературах у тармазных трубках можа ўтварыцца кандэнсат. З-за гэтай коркі тармазы могуць не спрацаваць. І, канешне ж, ніхто не адмяняў візуальны агляд сістэмы, каб не ўпусціць якую-небудзь шчыліну. Пакладзіце ў багажнік невялікую рыдлёўку для ачысткі падчас завеі. Таксама неабходна, каб там заўжды знаходзіўся трос.

— Які вогнетушыцель лепш за ўсё дапаможа патушыць пажар?

— Лепш за ўсё ўзяць прыладу аб'ёмам у пяць літраў. Што да тыпу, то для аўтамабіля лепш падыдзе парашковы. Ён універсальны, просты ў выкарыстанні і прызначаны для тушэння ўсіх відаў пажараў. Парашок пакрывае паверхню, утварае плёнку, якая не дае кіслароду трапіць у месца ўзгарання. А ў машыне ёсць такія дэталі, якім уласцівыя паўторныя ўзгаранні. Напрыклад, гэта пластыкавыя часткі, электрычныя драты.

— Напрыклад, я пачуў пах дыму ў салоне. Што трэба рабіць?

— Перш за ўсё — тут жа спыніцца. Выключыце запальванне. Ні ў якім разе не стаўце машыну на перадачу — толькі на ручны тормаз. Уключыце аварыйку. Выведзіце з машыны пасажыраў і пачынайце асцярожна аглядаць аўто. Пры самых нязначных падазрэннях трэба выклікаць эвакуатар.

Калі дым пайшоў з-пад капота, то неабходна адразу пачынаць тушэнне. Пры гэтым капот паднімаць нельга. Ва ўтворную прастору хлыне кісларод, і агонь пачне яшчэ больш імкліва распаўсюджвацца. Але ў капоце на такія выпадкі прадугледжаны страховачны механізм, дзякуючы якому пры адкрыцці накрыўка паднімаецца зусім нязначна. Усё, што можна зрабіць, — гэта прасунуць раструб вогнетушыцеля пад капот і пачаць тушыць агонь па чарзе з розных кропак.

Былі выпадкі, калі кіроўцы рамантавалі аўтамабілі, не пераапраналіся і ехалі дадому з гаража ў прамасленай вопратцы. Іскра выпадкова трапляла на адзенне — і чалавек ператвараўся ў факел...

— Як хутка згарае аўтамабіль?

— Час поўнага выгарання складае ад пяці да шасці хвілін, калі, вядома, не прымаць ніякіх мер.

— А з-за чаго часцей за ўсё гараць машыны?

— Як і ў побыце, адной з прычын становіцца курэнне ў салоне. Упусціў кіроўца цыгарэту, а яна закацілася ў месца, адкуль яе аператыўна дастаць складана. І недзе там унізе пачынаецца тленне... Таксама шмат пажараў з-за кароткага замыкання электраправодкі. Адбываецца яно не толькі з-за механічнага зносу дэталяў, але і з-за дадатковай нагрузкі. Скажам, паставілі даволі магутныя калонкі. І паступова ў нейкім месцы пачынае плавіцца ізаляцыя... Натуральнае старэнне замыкае сумную тройку лідараў. На яго долю прыходзіцца невялікі працэнт пажараў, але трэба ведаць, што пад маторным адсекам і пад капотам праходзяць паліўныя і маслаправоды. Пры цечы іх змесціва можа і загарэцца. Таму своечасова аглядайце ўсе вузлы.

Што да «экзотыкі», то ўзімку рэгіструюцца пажары з-за таго, што замерзлыя вадкасці спрабуюць адагравать... паяльнымі лямпамі. Асабліва гэта датычыцца грузавых аўтамабіляў. Таму, калі ёсць падазрэнні, што паліва або масла могуць крышталізавацца, машыну лепш загнаць у гараж, бо бяспечных спосабаў адагрэць паліўную сістэму не існуе.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. *schklennik@zviazda.by*

Якая яна, нямецкая культура?

У нашай краіне пачаліся чарговыя Тыдні Германіі, якія ўжо за 13 гадоў іх правядзення сталі важнай прыкметай культурнага жыцця сталіцы. І не толькі. Паступова ініцыятары Тыдняў пашыралі іх геаграфію. Сёлета гэты працэс дасягнуў у пэўным сэнсе сваёй кульмінацыі: як ніколі раней шмат цікавых і разнастайных мерапрыемстваў адбудуцца менавіта ў абласных цэнтрах і іншых гарадах Беларусі.

Гэта будзе шэсць займальных тыдняў: кінапаказы і тэатральныя пастаноўкі, канцэрты, аўтарскія чытанні, выставы, майстар-класы і лекцыі. Карацей, усе, хто цікавіцца культурай, традыцыямі, мовай і грамадствам Германіі, у шэрагу невялікіх і буйных мерапрыемстваў (яны працягнуцца да 31 кастрычніка) абавязкова знойдуць для сабе што-небудзь насамрэч цікавае і кранальнае. Ва ўсялякім разе, у гэтым упэўнены нямецкія і беларускія арганізатары Тыдняў.

Назавём асобныя цікавыя мерапрыемствы менавіта ў правінцыі. Напрыклад, у Брэсце пройдзе перасоўная выстава «Лагер смерці Трасцянец». Таксама ў Брэсце адбудуцца два канцэрты. Адзін будзе прысвечаны 220-годдзю з дня нараджэння Франца Шуберта. Другі — 25-годдзю абмену жаночымі дэлегацыямі Брэста і абшчыны Сярэдняй Шусенталі. Удзельнікі фотамарафону ў Маладзечне зробяць 12 здымкаў за 12 гадзін па 12 тэмах. Лепшыя фота ўпрыгожаць выставу «Дружба». У Полацку пройдзе фестываль кароткаметражных фільмаў з Майна. У Баранавічах — інтэлектуальная гульня для эрудытаў сярод вучняў старшых класаў. Пытанняў мноства, пераможцам стане адзін. У Гомелі пройдуць вечары нямецкага кіно, семінар па краязнаўстве «Адкрыць Германію».

У Гродне адкрыецца выстава, прымеркаваная да 500-годдзя Рэфармацыі. У Германіі гэта слынная дата. Скажам, як для нас 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. Дык вось, 31 кастрычніка 1517 года святар Марцін Лютэр прыбіў на вароты Замкавай царквы ў Вітэнбергу свае знакамітыя «95 тэзісаў».

Зразумела, па традыцыі, самая насычаная праграма чакае мінчан. Яны ўбачаць фільмы, атрымаюць асалоду ад класічнай музыкі, наведаюць тэатральныя спектаклі, канцэрты, фотавыставы, літаратурныя вечарыны, паслухаюць цікавыя і часам небясспрэчныя даклады, напрыклад, «Ці існуе нямецкая культура?» Хто зацікавіўся гэтай тэмай — калі ласка, на сустрэчу з лектарам з Германіі Беатрыс Пэцальд у Гістарычную майстэрню імя Леаніда Левіна. Падрабязнасці — у інтэрнэце на сайце нямецкага пасольства.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ЗРАЗУМЕЦЬ КРАІНУ ПРАЗ ПАЭЗІЮ

У сталічнай галерэі «Універсітэт культуры» адбылася літаратурна-мастацкая і музычная імпрэза — прэзентацыя кніжнай серыі Выдавецкага дома «Звязда» «Светлыя знакі. Паэты Кітая». На цяперашні момант выйшла ўжо дзявятая кніга маштабнага міжнароднага праекта — зборнік перакладаў арыгінальнага кітайскага паэта пачатку XX стагоддзя Сюй Чжымо. Творца цікавы тым, што яднае ў сваёй паэзіі ўсходні і заходні погляды на навакольны свет, захоўваючы традыцыі кітайскай рамантычнай лірыкі, уносіць у яе асобныя рысы еўрапейскага імпрэсіянізму.

Фота Кастуся ДРОБАВА.

Падчас мерапрыемства адбылося і адкрыццё выставы карцін «кітайскага цыкла» мастака Каміля Камала. Менавіта ён з'яўляецца ілюстратарам перакладных кніг Лі Цінчжаа, Ван Гачжэня, Мэн Хаажаня, Сюй Чжымо. Перад гасцямі выступіў і хор «Садружнасць» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (мастацкі кіраўнік — Ганна Нячай).

Вітальнае слова ўдзельнікам мерапрыемства даслаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Цуй Цымін, які скіраваў увагу на важнасць стратэгічнага культурнага супрацоўніцтва Кітая і Беларусі, асабліва ў сферы ўзаемных літаратурных перакладаў.

Юлія АЛЕЙЧАНКА.

■ Напярэдадні

Беларускі голас не згубіцца ў сусветным аркестры

Больш як 2 млн 100 тысяч чалавек зарэгістраваліся на сайце XIX Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў, які пройдзе ў Сочы з 15 па 21 кастрычніка. Але з улікам таго, што колькасць удзельнікаў абмежаваная 20 тысячамі чалавек, конкурс сярод ахвотных склаў 100 чалавек на месца!

У дэлегацыю Беларусі на сусветным фестывалі ўвайшло 300 чалавек ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў: гэта прадстаўнікі студэнцкага актыву з 27 ВНУ, маладзёжных грамадскіх арганізацый (Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, Лігі добраахвотнай працы моладзі, Беларускай асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА, Беларускай рэспубліканскай скаўцкай асацыяцыі), Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, рабочая моладзь, а таксама ветэраны маладзёжнага руху, якія прадстаўлялі нашу краіну на сусветных маладзёжных фестывалях у Маскве, на Кубе і ў Венесуэле.

Як падкрэслівае **начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Таццяна СІМАНОЎСКАЯ,** нашы дэлегаты будуць на свяце не проста гасцямі ці староннімі назіральнікамі. Прэзідэнтам перад імі пастаўлена задача — як мага больш расказаць пра нашу краіну і пра тое, што робіцца ў Беларусі ў інтарэсах маладых людзей, пра нашу маладзёжную палітыку. Таму яны стануць актыўнымі ўдзельнікамі панэльных дыскусій, круглых сталоў, будуць выступаць з дакладамі і прэзентацыямі. Абапіраючыся на папярэднюю праграму фестывалю, кожны мог вызначыцца з найбольш блізкім яму кірункам: ад культуры і адукацыі да навукі, экалогіі, працаўладкавання моладзі і міжнароднай бяспекі.

Між іншым, паколькі 2017 год аб'яўлены ў Расіі годам экалогіі, арганізатары спадзяюцца абысціся на фестывалі ўвогуле без папяровых носьбітаў, што для сучаснай моладзі, уласна кажучы, зусім не праблема. А яго сімвалам абраны рознакаляровы рамонак (сімвал фестывалю ў Маскве 1985 года), які сведчыць аб пераемнасці традыцый і сувязі пакаленняў. Але галоўным яго элементам сталі каляровыя пікселі як знак адзінства моладзі ўсяго свету ў інфармацыйную эпоху.

Падчас VI Сусветнага фестывалю моладзі ў Маскве ў 1957 годзе быў утвораны сусветны хор удзельнікаў фестывалю, а гэтым разам плануецца стварэнне сусветнага сімфанічнага аркестра. У першы дзень фестывалю ў Маскве адбудзецца міжнародны парад-карнавал студэнцтва. Асноўныя ж мерапрыемствы будуць праводзіцца ў сочынскім Алімпійскім парку. У Лядовым палацы адбудуцца цырымоніі адкрыцця і закрыцця фестывалю. На Алімпійскай плошчы «Медалс Плаза» ўстановяць сцэну для культурнай праграмы. Галоўны Медыяцэнтр прыме ўдзельнікаў навукова-адукацыйнай і дзелавой праграмы, тут жа разгорнецца маладзёжны Экспацэнтр, пройдуць выставы і кінапаказы. «Адлер-арэна» стане сцэнай для ўдзельнікаў Сусветнага маладзёжнага сімфанічнага аркестра, у «Ледзяным кубе» адкрыецца танцавальная акадэмія. На трасе «Сочы аўтадрома» будуць праходзіць спартыўныя турніры.

Заяўкі на ўдзел у сочынскім фестывалі паступілі з больш чым 180 краін свету.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■ Праз дзяцей — бацькам

Слухай сваё сэрца

Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа сумесна з арганізацыямі аховы здароўя правядзе 29 верасня адзіны ўрок па прафілактыцы сардэчна-сасудзістых захворванняў «Выбірай сэрцам!»

Завяршальным акордам буйства фарбаў выступаюць шматгадовыя кветкі, якія цвітуць восенню. Паколькі ў гэты перыяд яны на піку сваёй прыгажосці, рассаджваць іх варта з вялікай асцярожнасцю, каб пашкоджанне каранёвай сістэмы было мінімальным, забяспечыўшы тым самым працяглае цвіценне і паспяховае ўкараненне.

Упрыгажэннем кветніка ў гэты перыяд выступаюць: карэопсісы, геленіумы, расходнікі, астры. Але сапраўднымі каралевамі кампазіцый становяцца хрызантэмы.

Эфектным дадаткам кветкавай кампазіцыі могуць выступіць ярка-аранжавыя «ліхтарыкі» фізалісу. Прыгожая расліна з ядомымі пладамі, якія шырока ўжываюцца ў кулінарыі, размнажаецца шляхам высейвання насення ў грунт.

Даты Падзеі Людзі

27 ВЕРАСНЯ

1422 год — у адпаведнасці з Мельнскім мірным дагаворам (заключаны каля возера Мельна) з Тэўтонскім ордэнам у склад Вялікага Княства Літоўскага вернута ўся Жамойць (Жмудзь), паміж ордэнам і княствам усталявана мяжа.

1540 год — дзень заснавання Ордэна езуітаў. Ордэн быў зацверджаны папам Паўлам III і пабудаваны на прынцыпах адзіначалля і строгага цэнтралізму, жалезнай дысцыпліне і безумоўным падпарадкаванні волі старшых. Увага езуітаў была накіравана на вяртанне ва ўлонне каталіцкай царквы асоб, якія пакінулі яе, з дапамогай пропаведзяў, споведзі, арганізацыі прытулкаў для сірот. У 1773 годзе ордэн быў ліквідаваны папам Кліментам XIV. Але ўжо ў 1814 годзе адноўлены папам Піем VII для барацьбы супраць рабочага руху і сацыялізму. Перад ім была пастаўлена задача барацьбы з рэвалюцыяй. У руках езуітаў было больш за 1300 газет і часопісаў, многія навучальныя ўстановы.

1897 год — нарадзілася (г. Мінск) Ірма Пятроўна Яўнзем, беларуская і расійская спявачка, збіральніца народных песень, заслужаная артыстка Беларусі, народная артыстка Расіі. Вучылася ў Петраградскай кансерваторыі. З 1921 года працавала ў Мінску, на канцэртах выконвала запісаныя ёю ж беларускія народныя песні. З 1923 года выкладала ў Беларускай драматычнай студыі ў Маскве, у 1925—1963 гадах — артыстка Маскоўскай філармоніі. Першая ў СССР пачала выконваць песні народаў свету на нацыянальных мовах, у рэпертуары было больш як пяць тысяч узораў песеннай творчасці больш як 60 народаў свету, у тым ліку ў апрацоўках беларускіх кампазітараў. Падрыхтавала зборнікі «Рэвалюцыйныя песні народаў». Аўтар кнігі «Чалавек ідзе за песняй». Памерла ў 1975 годзе.

1902 год — нарадзілася Соф'я Сяргееўна Панкова, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. З 1926 года на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі: загадчыца аддзела Брэсцкага акруговага, Пінскага гарадскога камітэтаў КПЗБ. Дэлегат I з'езда КПЗБ (1928). За рэвалюцыйную дзейнасць у 1928-м арыштавана польскімі ўладамі. Пасля вызвалення, з 1931 года, жыла ў Мінску. Працавала ў Інстытуце гісторыі партыі і рэвалюцыйнага руху, Мінскай школе КПЗБ. З канца 1934 года — сакратар Навагрудскага, Беластоцкага, Гродзенскага акруговых камітэтаў КПЗБ. У 1935-м зноў арыштавана, прысуджана да 12 гадоў турмы. У 1939—1941 гадах працавала ў Беластоку. Падчас Вялікай Айчыннай вайны накіравана ў акупіраваны Віцебск, дзе сумесна з В. Харужай арганізавалі работу антыфашысцкага падполля. У 1942 годзе арыштавана і закатавана фашыстамі.

1917 год — для ўдасканалення сістэмы нарміравання забеспячэння ў Мінску быў праведзены перапіс насельніцтва, згодна з якім жыхарамі горада лічылі сябе 134,5 тыс. чалавек.

1942 год — у разгар баёў у Сталінградзе штурмавая група сяржанта Якава Паўлава заняла дом, які ў далейшым служыў важным апорным пунктам у сістэме абароны дывізіі, і ўтрымлівала яго 58 дзён да падыходу падмацавання. Абарона «Дома Паўлава» ўвайшла яркай старонкай у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны.

Было сказана

Міхась СТРАЛЬЦОЎ, пісьменнік:
«Мінулае наша гэтак жа неаддзельнае ад нас, як і будучае».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.04	18.56	11.52
Віцебск —	6.54	18.45	11.51
Магілёў —	6.54	18.46	11.52
Гомель —	6.50	18.43	11.53
Гродна —	7.20	19.11	11.51
Брэст —	7.20	19.12	11.52

Месяц

Першая квадра 28 верасня.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *УЗВІЖАННЕ, Івана.*
К. *Вінцэнта, Дамяна, Касмы.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Нашы грузчыкі без усялякіх там брытанскіх навукоўцаў правялі даследаванне і высветлілі, што жаночая прыгажосць вымяраецца ў стаграмах, а таксама, што прадаўшчыца Люба на дзве чаркі прыгажэйшая за кладаўшчыцу Ганну.

Дзеці — кветкі жыцця :)

Пляцоўка, шмат дзяцей. Адна дзяўчынка крычыць на ўвесь двор:

— Тата, ці ты хутка падыдзеш да мяне, ці я папрашу бабулю зноў прыехаць да нас на тыдзень!

І тата пабег!

З тлумачальнай:

«Устаў раніцай, глянуў у люстэрка — сам сябе не пазнаў. Вырашыў на работу не ісці, таму што фізіяномія мая не сыходзілася з фатаграфіяй на пропуску».

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3557. Нумар падпісаны ў 19.30 26 верасня 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Мясцовае самакіраванне
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
27 верасня 2017 г. №36 (420)

СУСТРЭНЕМСЯ КАЛЯ РАТУШЫ

ПАСЛЯ таго як у 1597 годзе Віцебск атрымаў Магдэбургскае права, пачалося будаўніцтва драўлянай ратушы — сімвала гарадскога самакіравання. Але ж пасля паўстання віцяблян у 1623 годзе яе разабралі. Другі раз ратушу пабудавалі ў 1644-м, калі гораду былі вернуты прывілеі... У XVIII стагоддзі яна тройчы была знішчана пажарамі. І пасля чарговага пачалі ўзводзіць мураваны будынак. Будаўніцтва завяршылася ў 1775 годзе.

У 1833-м на вежы ўсталявалі гадзіннік. А замест высокага шатровага даху была зроблена назіральная пляцоўка з невялікай ратондай.

Тыя, хто цікавіцца гісторыяй Віцебска, ведаюць, што да 1911 года ніжняя частка ратушы была двухпавярховай. Тады ж надбудавалі трэці паверх.

З 1924 года ў ратушы знаходзіцца Віцебскі абласны краязнаўчы музей.

— У наш час тут можна пабачыць не толькі цікавыя экспазіцыі і выстаўкі або заказаць экскурсію. Вельмі папулярныя розныя квэсты. Дзеці могуць адсвяткаваць дзень нараджэння, а дарослыя — зарэгістраваць шлюб, — расказвае **Валерый ШЫШАНАЎ, намеснік дырэктара Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.**

Шмат людзей купляюць білеты для таго, каб трапіць на назіральную пляцоўку. Адтуль, з вышыні птушынага палёту, горад адкрывае па-новаму сваю прыгажосць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

У панядзелак, 2 кастрычніка, адкрываецца чарговая сесія Нацыянальнага сходу Беларусі

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:

ПА СУТНАСЦІ

«Патэнцыял «мясцовых парламентаў» не вычарпаны»

Фота БЕЛТА.

Якія законапраекты плануецца разгледзець на наступнай сесіі, як будзе фарміравацца бюджэт і на чым робіць акцэнт Нацыянальны сход у сваёй інфармацыйнай палітыцы? На гэтыя і іншыя пытанні «МС» адказаў Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.

Ад барацьбы з тэрарызмам да правоў спажыўцоў

— Зусім хутка адкрыецца чарговая сесія ў Савеце Рэспублікі і Палаце прадстаўнікоў. Што нам рыхтуе новы парламенцкі год? Якія асноўныя пытанні дзяржаўнага развіцця будуць абмяркоўвацца?

— На сёння партфель законапраектаў, якія плануюцца да разгляду ў ходзе асенняй сесіі парламента, налічвае амаль паўсотні дакументаў.

Законапраектамі прадугледжваецца ўдасканаленне адносін у сферах дзяржаўна-прыватнага партнёрства, процідзеяння манапалістычнай дзейнасці і развіцця канкурэнцыі, дзяржаўных закупак, дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомасці, аховы праў спажыўцоў. Плануецца карэкціроўка шэрагу кодэксаў Рэспублікі Беларусь, звязаных з грамадскай бяспекай, заканадаўства аб барацьбе з тэрарызмам і па пытаннях абароны. Будзе аддадзена ўвага прававой базе, якая рэгулюе якасць і бяспеку харчовай сыравіны і прадуктаў харчавання, пітное водазабеспячэнне. У сацыяльнай сферы перагледжваюцца законы «Аб ветэранах», «Аб фізічнай культуры і спорце». Значная частка праектаў накіравана на заканадаўчае зацвярджэнне міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

стар. 2

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Дэпутаты дапамагаюць прасоўваць канструктыўныя мясцовыя ініцыятывы»

Фота БЕЛТА.

Падчас мінулагодніх парламенцкіх выбараў і нацыянальныя, і замежныя назіральнікі канстатавалі высокую яўку. Сапраўды, дэпутат, парламентарый у нашай краіне — чалавек, які карыстаецца выключнай павагай і важкім — грамадскім — уплывам. Пра тое, як народныя выбраннікі працуюць з людзьмі, як грамадская ініцыятыва знаходзіць увасабленне ў рэальных законах, «МС» расказаў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

Адказнасць мы не дзелім

— Штомесяц дэпутаты Палаты прадстаўнікоў пэўны час працуюць у сваіх акругах. Гэта і прыёмы грамадзян на базе гар- і райвыканкамаў, і выязныя прыёмы ў вёсках, і сустрэчы з працоўнымі калектывамі. Наколькі важнае для іх супрацоўніцтва з мясцовымі органамі ўлады? Як пабудавана гэтая сістэма ўзаемадзеяння?

— Супрацоўніцтва, пра якое вы пытаецеся, для нас вельмі важнае. Бо праблемы, з якімі звяртаюцца да нас людзі, закранаюць практычна ўсе сферы грамадскіх адносін. Але рашэнне большасці пытанняў, няхай гэта будзе занятасць насельніцтва, развіццё інфраструктуры, будаўніцтва жылля, добраўпарадкаванне тэрыторый, газіфікацыя населеных пунктаў, забеспячэнне пітной вадой і г.д., залежыць ад рэальных сацыяльна-эканамічных умоў, кампетэнтнасці і паваротлівасці кіраўніцкіх кадраў.

стар. 3

«Патэнцыял «мясцовых парламентаў» не вычарпаны»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)

Акрамя таго, Савет Рэспублікі ўпершыню выступае ў якасці суб'екта права заканадаўчай ініцыятывы і распрацоўвае праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах». Работа над законапраектам практычна завершана. Спадзяёмся, што вынікам работы з прапановамі дзяржаўных органаў, выдавецтваў, выканаўцаў і іншых зацікаўленых стане праект нарматыўнага прававога акта, які забяспечыць неабходны баланс інтарэсаў як праваўладальнікаў, так і грамадства.

Хачу адзначыць таксама, што парламентарыі актыўна ўключыліся ў працу па падрыхтоўцы праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2018 год».

Фарміраванне бюджэту завяршаецца

— Вы сказалі, работа над фарміраваннем бюджэту на наступны год ужо ідзе. Традыцыйна дзяржава імкнецца падтрымаць яго сацыяльны складнік... На што зарыентуецца будучы бюджэт? Якія чаканні наконт гэтага ў Савета Рэспублікі?

— Работа над рэспубліканскім бюджэтам на 2018 год пераходзіць у завяршальную стадыю. Як і ў мінулыя гады, праект бюджэту звярстаны з прафіцытам каля 700 мільёнаў рублёў, які плануецца накіраваць на абслугоўванне знешняга доўгу. Гэта значыць, што краіна паслядоўна разлічваецца па сваіх міжнародных абавязках.

> Даходы бюджэту будуць расці, прычым без павелічэння складу і памеру падаткаў. Так, павелічэнне даходаў прадугледжана на 7,8 працэнта ў параўнанні з бягучым годам, а падатковая нагрузка складзе 24,4 працэнта да валавога ўнутранага прадукту (паказчык адпавядае ацэнцы 2017 года). Гэта пазітыўны сігнал для рэальнага сектара эканомікі, бізнесу.

Безумоўна, бюджэт 2018 года будзе несці значную сацыяльную нагрузку. Я прывяду ўсяго некалькі лічбаў. Фонд аплаты працы плануецца павялічыць на 18 працэнтаў. А гэта ў першую чаргу рост зарплаты для работнікаў бюджэтнай сферы. Выдаткі бюджэту на будоўлю жылля для маладых і многадзетных сем'яў таксама павялічацца на 7 і 20 працэнтаў адпаведна.

Разам з тым для парламентарыяў прынцыпова, каб бюджэт наступнага года быў бюджэтам развіцця. Гэта значыць, што патрэбны бюджэтныя інвестыцыі пад эфектыўныя праекты ў прамысловасці, аграрным сектары, навуцы, неабходна больш сур'ёзная дзяржаўная падтрымка экспарту. Усё гэта будзе садзейнічаць стварэнню новых высокапрадукцыйных працоўных месцаў, прынясе валютную выручку ў краіну і ў выніку папоўніць бюджэт.

Мы сёння вельмі цесна супрацоўнічаем з Міністэрствам фінансаў па названых пытаннях, выпрацоўваем пазіцыі, якія дазволяць узмацніць інвестыцыйны складнік бюджэту без істотнага перагляду выдаткаў па іншых кірунках.

Вельмі важна таксама, каб бюджэт на 2018 год фарміраваўся ўжо з улікам нормаў пакета нарматыўных прававых актаў па ўдасканаленні ўмоў вядзення бізнесу, інвестыцыйнага заканадаўства, даручэнняў кіраўніка дзяржавы па забеспячэнні эфектыўнай занятасці, развіцці IT-сферы і гэтак далей.

Сукупнасць усіх гэтых фактараў мы будзем улічваць у рабоце над пакетам бюджэтных законапраектаў.

Паўнамоцтвы — рэальныя

— Тэндэнцыя апошняга часу — перадаваць мясцовым органам улады паўнамоцтвы па шэрагу пытанняў: ад прэферэнцый для бізнесу да вызначэння асоб, якія павінны плаціць падатак па беспрацоўі. Да гэтага такія рашэнні прымалі вышэйстаячыя інстанцыі і іншыя органы. Наколькі мясцовая ўлада гатовая выконваць такія паўнамоцтвы?

Першага верасня Міхаіл Мясніковіч наведаў Мінскі дзяржаўны каледж электронікі.

Фота БЕЛТА.

— Мясцовыя органы ўлады вырашаюць найважнейшыя пытанні мясцовага значэння. Спектр іх вельмі шырокі — ад праблем эканамічнага развіцця да сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Трэба адзначыць, што Саветы дэпутатаў вельмі цесна працуюць з органамі мясцовага кіравання. Таму тая стабільнасць у грамадстве, якую мы сёння маем, — адзін з доказаў таго, што мясцовыя ўлады паспяхова спраўляюцца з пастаўленымі задачамі. А тое, што мясцовыя органы ўсё больш уключаюцца ў працэс прыняцця эканамічных і сацыяльных рашэнняў, — аб'ектыўная неабходнасць. На пятым Усебеларускім народным сходзе была падкрэслена іх асаблівая роля ў прыцягненні інвестыцый. Так, ніхто лепей, чым яны, не ведае патэнцыял канкрэтнага рэгіёна, не можа вызначыць тыя галіны мясцовай эканомікі, развіццё якіх прынясе неабходны эканамічны эфект. Будуць інвестыцыі — будзе папаўняцца бюджэт, узрасце колькасць занятых у эканоміцы, узровень заработнай платы, а ў выніку — выйграе кожны чалавек. Інвестыцыі ідуць туды, дзе мясцовыя ўлады «не спяць», а прадметна займаюцца гэтымі пытаннямі. Мясцовыя органы павінны стаць флагманамі ў гэтай справе.

У сваю чаргу мы, заканадаўцы, павінны ствараць неабходныя ўмовы для плённай і эфектыўнай работы на месцах. Напрыклад, нядаўна былі прыняты рашэнні, якія гарантуюць нязменнасць на працягу трох гадоў нарматываў адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў у мясцовыя бюджэты. Гэта мера дазволіць мясцовым органам улады быць больш самастойнымі пры рашэнні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця падведамасных тэрыторый.

> 19 верасня Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка падпісаў Указ №337 «Аб рэгуляванні дзейнасці фізічных асоб», які пашырае пералік відаў дзейнасці без юрыдычнага афармлення. Гэта добрая навіна. Нормы дадзенага ўказа былі сфарміраваны ў тым ліку на аснове ініцыятыў і прапаноў Савета Рэспублікі.

Выбаршчык патрабуе канкрэтыкі

— Грамадская ініцыятыва, як і работа органаў самакіравання, мае патрэбу ў інфармацыйнай падтрымцы. Так, людзям важна ведаць, чым жыве іх акруга, раён, нават вуліца. Уладам жа трэба мець зваротную сувязь з жыхарамі. А якія нюансы працы дэпутатаў на месцах, на вашу думку, СМІ павінны асвятляць абавязкова?

— У першую чаргу хачу адзначыць, што роля сродкаў масавай інфармацыі ў фарміраванні меркавання насельніцтва аб органах улады вельмі значная. Таму менавіта органы ўлады павінны цесна і канструктыўна ўзаемадзейнічаць са СМІ. З дапамогай СМІ не толькі ўлада даводзіць свае ідэі і рашэнні да народа, а і наадварот — грамадская думка становіцца вядомая органам кіравання. Так што ўсё ўзаемазвязана. Хто такія прадстаўнікі ўлады? Гэта такія ж грамадзяне, але з пэўнымі паўнамоцтвамі. А дэпутаты — гэта прадстаўнікі канкрэтных выбаршчыкаў. Таму з іх і патрабаванні большыя.

> Не патрэбны выбаршчыку ніякія лічбы — колькі зваротаў разглядзеў, колькі пасяджэнняў выканкамаў наведаў, колькі разоў у камандзіроўку з'ездзіў... Выбаршчык павінен бачыць канкрэтны вынік.

Чалавеку цяжка адчуваць сябе падманутым, асабліва ў сваіх чаканнях. Нельга даваць людзям абяцанняў, якія немагчыма здзейсніць. Таму дэпутаты і мясцовых Саветаў, і Палаты прадстаўнікоў, а таксама члены Савета Рэспублікі, не маюць ніякага маральнага права выкручвацца, апраўдвацца.

Не патрэбны выбаршчыку ніякія лічбы — колькі зваротаў разглядзеў, колькі пасяджэнняў выканкамаў наведаў, колькі разоў у камандзіроўку з'ездзіў... Выбаршчык павінен бачыць канкрэтны вынік: дзякуючы дапамозе дэпутата адрамантавана дарога, арганізаваны падвоз вучняў, створаны новыя рабочыя месцы і г. д.

На жаль, сёння насельніцтва мала інфармавана аб рабоце Саветаў дэпутатаў: па выніках сацыялагічнага апытання поўную інфармаванасць адзначае толькі ад 0,7 да 2,8 працэнта грамадзян. Атрымліваецца, што людзі не заўсёды ведаюць, чым займаецца ўлада. Таму дэпутатам не трэба саромецца расказваць, у тым ліку пры дапамозе сродкаў масавай інфармацыі, што імі ці з іх удзелам зроблена, што, як ім здаецца, неабходна зрабіць для канкрэтнага раёна, горада, вёскі. Не трэба баяцца цікавіцца і думкай грамадзян. Павінен быць дыялог, а не маналог.

— Раённая прэса традыцыйна карыстаецца павагай сярод сваіх чытачоў. Наколькі цікавай вам падаецца ідэя, каб раённыя газеты аддавалі пастаянную ўвагу менавіта праблемам мясцовага кіравання?

— А якім яшчэ праблемам павінна ўдзяляць увагу мясцовая прэса? Бясспрэчна, у мясцовых сродках масавай інфармацыі абавязкова павінна расказвацца пра падзеі рэспубліканскага значэння, прынятыя Прэзідэнтам ці ўрадам рашэнні, законапраекты, якія разглядаюцца ў парламенце. Але ў першую чаргу яны павінны асвятляць жыццё свайго рэгіёна. Чалавека больш хвалюе тое, што датычыцца непасрэдна яго. Таму мясцовая прэса павінна быць «вачамі і вушамі» грамадства. На маю думку, папулярнасцю можа карыстацца рубрыка, прысвечаная канкрэтнаму сельскаму Савету. Напаўняць яе могуць як прадстаўнікі ўлады, так і простыя людзі. Карысна было б параўнаць, як ацэньваюць рэалізацыю пытанняў жыццезабеспячэння і чыноўнікі, і дэпутаты, і непасрэдна самі жыхары. Мабыць, гэта была б самая праўдзівая і аб'ектыўная ацэнка работы органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Такія рубрыкі не тое што могуць, а павінны быць у кожнай газеце. Інакш улада рызыкуе размаўляць сама з сабой. У сваю чаргу і рэспубліканскія газеты павінны адлюстроўваць і праблемы, і добрыя ініцыятывы рэгіёнаў.

Наогул, неабходна помніць, што СМІ не могуць пакараць, але могуць пакрытыкаваць, не могуць узнагародзіць ці прызначыць на пасаду, але могуць зрабіць чалавека папулярным.

Мясцовыя амбудсмены

— Парламентарый — гэта гучыць горда. Але не менш ганарова быць і дэпутатам мясцовага Савета. Цябе абралі людзі, а гэта значыць, што яны давяраюць табе клопат пра родны населены пункт, раён. Якая роля дэпутата мясцовага Савета ў нашы дні?

— Спектр адказнасці дэпутатаў мясцовых Саветаў, вобразна кажучы, ад парадку на зямлі да «парадку ў галавах». Упэўнены, што патэнцыял «мясцовых парламентаў» не вычарпаны. Сапраўды, ключавыя рашэнні прымаюцца ў цэнтры. Але дэпутаты мясцовых Саветаў не павінны заставацца ўбаку. Па-першае, яны прызваны быць праваднікамі чаканняў людзей знізу наверх, саўтарамі рашэнняў дзяржаўнага значэння. Па-другое, прызначэнне дэпутатаў — актыўна тлумачыць ужо прынятыя нарматыўныя прававыя акты і забяспечваць на месцы ўмовы для іх рэалізацыі.

> Што граху таіць — выкананне многіх рашэнняў «прабуксоўвае» з-за іх першапачатковай недастаткова глыбокай прапрацоўкі, у тым ліку і мясцовымі Саветамі. На гэтую праблему звяртаў увагу і кіраўнік дзяржавы, калі закранаў пытанне барацьбы з сацыяльным утрыманствам.

Такія актуальныя задачы, як зніжэнне выдаткаў, эфектыўная занятасць, работа з моладдзю — гэта ўсё тое, дзе павінны максімальна прыкладацца намаганні дэпутатаў. Сёння існуе вострая неабходнасць стварэння новых высокапрадукцыйных рабочых месцаў. Роля дэпутата мясцовага Савета — вывучыць рэальную карціну і адрэагаваць, калі статыстычныя лічбы акажуцца «дутымі». А яшчэ дэпутаты маглі б праявіць сябе ў тых сферах, якія для іх пакуль нязвыклыя, але цалкам ім пад сілу. Напрыклад, мы многа гаворым пра стварэнне спрыяльных умоў для развіцця бізнесу. Лічу, што дэпутаты могуць стаць кімсьці накшталт мясцовых амбудсменаў для прадстаўнікоў сацыяльна адказнага бізнесу — прадпрымальнікаў, якія своечасова выплачваюць «белую» заработную плату, ствараюць новыя рабочыя месцы, забяспечваюць работнікам годны сацыяльны пакет.

Спецыфіка кампаніі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў такая, што мы выбіраем у дэпутаты чалавека, якога амаль заўсёды ведаем у твар, працуем разам з ім, жывём на адной вуліцы, хадзілі ў адну школу... І папулізмам у гэтым выпадку людзей не падманеш.

Ад кандыдата патрэбны канкрэтныя справы, дасягненні, а не «салаўіныя песні» пра лепшую будучыню.

Таму хачу пажадаць, каб чарговыя выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў, якія адбудуцца ў наступным годзе, прайшлі на высокім арганізацыйным узроўні, у строгай адпаведнасці з нацыянальным выбарчым заканадаўствам, каб народ выбраў найлепшых, адказных кандыдатаў, якія будуць адстойваць інтарэсы і дабівацца рашэння надзённых праблем свайго электарата.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

«Дэпутаты дапамагаюць прасоўваць канструктыўныя мясцовыя ініцыятывы»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)

Таму кожны новы працоўны тыдзень дэпутата ў акрузе, як правіла, пачынаецца з сустрэчы з кіраўніцтвам адміністрацыі, дэпутатамі мясцовых Саветаў. Парламентарыі рэгулярна ўдзельнічаюць у абмеркаванні пытанняў, якія выносяцца на пасяджэннях выканаўчых і распарадчых органаў, буйных грамадскіх аб'яднанняў. На асабістыя прыёмы грамадзян дэпутат запрашае прадстаўнікоў адпаведных службаў, якія дапамагаюць зняць большасць праблем непасрэдна ў ходзе прыёму.

Мы вельмі цэнім гэтую дапамогу, але і самі не застаёмся ў даўгу. Працуючы ў акрузе, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў аддаюць прыярытэтную ўвагу вырашэнню надзённых эканамічных задач і пытанняў падтрымкі прадпрыемстваў, стварэння новых працоўных месцаў, развіцця сацыяльнай інфраструктуры і захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Дэпутаты дапамагаюць прасоўваць канструктыўныя мясцовыя ініцыятывы, прыцягваць насельніцтва да вырашэння задач, з якімі можна справіцца сваімі сіламі, выкарыстоўваюць свае міжнародныя кантакты для прыцягнення інвестараў. Пытанні, якія складана вырашыць на мясцовым узроўні, становяцца для парламентарыяў зыходным пунктам у іх заканадаўчай дзейнасці і дыялогу з урадавымі структурамі.

— Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў выбіраюцца грамадзянамі непасрэдна, членаў Савета Рэспублікі выбіраюць мясцовыя Саветы дэпутатаў. А чым адрозніваецца работа дэпутата Палаты прадстаўнікоў у выбарчай акрузе ад работы яго калегі — члена Савета Рэспублікі?

— Перш за ўсё, усе мы працуем адзінай камандай і робім агульную справу. Што датычыцца кантактаў з насельніцтвам, працоўнымі калектывамі, асабістых прыёмаў — тут у нас вельмі шмат падобнага. Больш за тое, дэпутаты і члены Савета Рэспублікі нярэдка праводзяць сумесныя прыёмы грамадзян.

Калі казаць пра адрозненні, пачнём з таго, што дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працуюць на прафесійнай аснове і практычна траціну свайго працоўнага часу праводзяць у выбарчых акругах. Сенатары ж застаюцца на ранейшай пасадзе і сумяшчаюць парламенцкія функцыі з выкананнем сваіх асноўных службовых абавязкаў.

Яшчэ адно адрозненне заключаецца ў тым, што нашы дэпутаты, можа быць, у большай ступені канцэнтруюцца на вывучэнні практыкі прымянення заканадаўства, а калегі з Савета Рэспублікі — на пытаннях удасканалення дзейнасці органаў мясцовага самакіравання і каардынацыі ўзаемадзеяння паміж імі і органамі дзяржаўнага кіравання. Хоць і тут мы шмат у чым узаемадапаўняем адно аднаго.

Нарэшце, у адрозненне ад члена Савета Рэспублікі дэпутат абавязаны не радзей за адзін раз на год рабіць справаздачу перад выбаршчыкамі аб праведзенай рабоце. А ў цэлым, паўтаруся, адказнасці мы не дзелім. Праца з людзьмі — наш агульны клопат.

Заканадаўчая ініцыятыва расце

— Падчас прыёмаў грамадзян, якія рэгулярна праводзяць дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, людзі часам прыходзяць з прапановамі па ўдасканаленні заканадаўства. Наколькі такія прапановы рэалізуюцца ў канкрэтных заканадаўчых актах? Можа, на працягу наступнай сесіі будуць прымацца змяненні, прадыктаваныя зваротамі і прапановамі грамадзян?

— Прыкладаў, калі грамадзяне ставяць перад намі пытанні, якія патрабуюць прыняцця прававых рашэнняў, дастаткова шмат. Больш за тое, парламентарыі зацікаўлены ў падтрыманні пастаяннай зваротнай сувязі з выбаршчыкамі. Менавіта ў гэтых мэтах была пашырана практыка грамадскага абмеркавання законапраектаў, павялічаны час правядзення асабістых прыёмаў у Палаце прадстаўнікоў, укаранёны механізм электронных зваротаў. Вынікі кажуць самі за сябе. Калі ў чацвёртым скліканні колькасць зваротаў, прысвечаных удасканаленню заканадаўства, была меншая за 13 працэнтаў, то ў пятым яна павялічылася больш чым у тры разы. А сёння з улікам пытанняў тлумачэння законаў і зваротаў у Канстытуцыйны суд доля прапаноў, што непасрэдна датычацца кампетэнцыі Палаты прадстаўнікоў, складае без малога 48 працэнтаў.

Падчас адкрыцця дзіцячага садка ў Глыбокім.

Фота БЕЛТА.

Уся гэтая інфармацыя дэталёва аналізуецца ў пастаянных камісіях, абагульняецца і рэалізуецца на ўсіх стадыях заканадаўчага працэсу. Вынікам такой работы становяцца, напрыклад, прапановы, якія штогод уносяцца ў праект закона аб рэспубліканскім бюджэце.

> Раней з улікам меркаванняў, выказаных грамадзянамі, была праведзена карэкціроўка заканадаўства аб ахове здароўя, мовах, зваротах грамадзян і юрыдычных асоб, рэгістры насельніцтва, дзяржаўным рэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання, рэкламе. І гэта далёка не поўны пералік.

Сярод зусім свежых прыкладаў — новая рэдакцыя Закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей». Распрацоўшчыкі прапаноўвалі ажыццяўляць пераразлік памеру дапамогі на дзяцей да трох гадоў толькі адзін раз на год. Але, ведаючы пазіцыю выбаршчыкаў, дэпутаты настаялі на тым, каб гэты пераразлік рабіўся двойчы.

Кажучы пра нашы найбліжэйшыя планы, трэба адзначыць, што на восеньскай сесіі мы збіраемся разгледзець дзве сур'ёзныя дэпутацкія ініцыятывы па ўдасканаленні заканадаўства аб інвестыцыях і прыватызацыі. Распрацоўка гэтых дакументаў шмат у чым з'яўляецца вынікам абмеркавання праблемных пытанняў у рэгіёнах і на сустрэчах з працоўнымі калектывамі.

Да другога чытання рыхтуецца яшчэ адзін дэпутацкі законапраект. Ён прадугледжвае ўвядзенне адказнасці за ўключэнне ў жыроўкі платы за неасноўныя жыллёва-камунальныя паслугі без заключэння дагавораў на іх аказанне. Гэтым жа праектам устанаўліваецца і адказнасць для службовых асоб за наўмыснае раскрыццё персанальных даных грамадзян. Акрамя таго, з улікам зваротаў выбаршчыкаў плануецца ўнесці змяненні ў Закон «Аб абароне праваёў спажыўцоў». Гаворка ідзе, напрыклад, пра парадак вяртання складанабытавой тэхнікі, а таксама аб размяшчэнні на таварах інфармацыі на беларускай і (або) рускай мовах.

Баланс інтарэсаў дзяржавы і грамадства

— Быць дэпутатам — ганаровая праца. З вашага пункту гледжання, якая роля дэпутата ў XXI стагоддзі?

— Мяркую, што галоўная функцыя парламентарызму як асноўнага інстытута дэмакратыі застаецца нязменнай. Толькі выконваць яе ў наш час нашмат цяжэй. Жыццё стала больш імклівым, структура грамадства — больш складанай. Прывесці каштоўнасці мноства сацыяльных і эканамічных груп да агульнага множніка, забяспечыўшы пры гэтым устойлівы баланс інтарэсаў дзяржавы і грамадства, — задача не з лёгкіх. Але толькі так можна захаваць народнае адзінства, без якога немагчыма даць годны адказ на выклікі і пагрозы сучаснасці.

> Вядома, у тым, што геаграфічныя, нацыянальныя, моўныя бар'еры паступова знікаюць, ёсць пэўны плюс. У людзей, асабліва ў моладзі, з'яўляецца больш шанцаў для самарэалізацыі. Але тое, што пры гэтым размываюцца і традыцыйныя каштоўнасці, сямейныя, духоўныя, культурныя, не можа не турбаваць.

Парламентарыі заўсёды былі сілай, якая кансалідуе грамадства, і сёння гэта асабліва значна. Бо паспяховая рэалізацыя нашых сацыяльна-эканамічных планаў у цяперашніх умовах патрабуе мабілізацыі ўсіх матэрыяльных і інтэлектуальных сіл краіны. Таму найважнейшай нашай задачай з'яўляецца падтрыманне і развіццё шырокага грамадска-палітычнага дыялогу ў мэтах захавання народнага адзінства, сацыяльнай салідарнасці, павышэння прававой, эканамічнай і палітычнай культуры насельніцтва.

Важны таксама міжнародны аспект гэтай задачы. І галоўнае тут — актыўны ўдзел у міжнародных намаганнях па захаванні міру, які становіцца ўсё больш кволы.

Што датычыцца непасрэднай работы з людзьмі, асаблівым клопатам дэпутата была і застаецца падтрымка тых, хто без дапамогі дзяржавы не ў стане вырашыць свае жыццёвыя праблемы. Гэта перш за ўсё шматдзетныя і няпоўныя сем'і, пенсіянеры, ветэраны, сіроты, людзі з абмежаванымі магчымасцямі.

Мабілізуючы фактар

— Дэпутаты часта прымаюць удзел у розных дабрачынных акцыях і выступаюць ініцыятарамі многіх добрых і патрэбных спраў. Наколькі ў сувязі з гэтым важная для парламентарыяў інфармацыйная падтрымка?

— Гэта сур'ёзны мабілізуючы фактар, і дэпутаты актыўна супрацоўнічаюць са сродкамі масавай інфармацыі, прычым не толькі для арганізацыі масавых дабрачынных, культурных або спартыўных акцый. Перш за ўсё гэта дае магчымасць аператыўна інфармаваць насельніцтва аб рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, мерах, якія прымаюцца органамі ўлады па забеспячэнні ўстойлівага развіцця краіны, растлумачваць дзейнічае заканадаўства і прыцягваць грамадзян да ўдзелу ў абмеркаванні законапраектаў, якія маюць прынцыповае значэнне для дзяржавы і грамадства.

— Як вядома, газета «Звязда» — парламенцкае выданне, якое, да таго ж, мае спецыяльны дадатак для выбаршчыкаў і дэпутатаў «Мясцовае самакіраванне». Якую ролю яна адыгрывае ў штодзённай рабоце Нацыянальнага сходу?

— «Звязда» заўсёды годна прадстаўляла парламент у інфармацыйнай прасторы краіны і дапамагала нам падтрымліваць дыялог з грамадскасцю. Газета штодня дае аператыўную, а галоўнае, аб'ектыўную інфармацыю аб заканадаўчай дзейнасці, міжпарламенцкім супрацоўніцтве, рабоце парламентарыяў у выбарчых акругах. Дзякуючы вам дэпутаты маюць магчымасць выказаць сваю пазіцыю па самых жыццёва важных грамадска-палітычных пытаннях і своечасова данесці яе да насельніцтва. У сувязі са стагоддзем вашага выдання шчыра жадаю ўсяму творчаму калектыву «Звязды» натхнення, яркіх публікацый і новых поспехаў у дзейнасці на карысць роднай Беларусі.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

ДАЙДЖЭСТ НАВІН

Першы бізнес-інкубатар

адкрыўся сёлета ў Баранавічах

Ідэя стварыць такую пляцоўку ў горадзе належыць Наталлі Фёдаравай, першаму намесніку старшыні Баранавіцкага гарвыканкама. Ажыццявіць яе ўзяўся Руслан Асадулаеў — вопытны менеджар, дырэктар сеткі грамадскага харчавання ў мінулым, а зараз — дырэктар баранавіцкага бізнес-інкубатара. Як паведамляе газета «Наш край», гарвыканкам перадаў бізнес-інкубатару памяшканні на вуліцы Піянерскай, у якіх размяшчаюцца рэзідэнты. Пачаткоўцы прадпрымальнікі могуць атрымаць на льготных умовах сучасныя мэбляваныя офісы ў арэнду.

Зараз у інкубатары працуюць 17 рэзідэнтаў. Увогуле ў сферы прадпрымальніцтва Баранавічаў за восем месяцаў было створана 1 618 новых працоўных месцаў, 708 чалавек за гэты час працаўладкаваны ў якасці наёмных работнікаў да індывідуальных прадпрымальнікаў.

Гаспадарчыя пытанні

заўсёды на парадку дня

Як паведаміла газеце «Зара» старшыня Вярхоўскага сельвыканкама Бешанковіцкага раёна Зінаіда Сляская, выкананне мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні тэрыторый вядзецца цэлы год. Ужо зрабілі прыборку пяску і расліннасці ўздоўж тратуараў. У парку каля фізкультурна-аздараўленчага комплексу аднавілі лесвічную пляцоўку, акультурылі помнікі. Адрамантавалі і падмалявалі агароджу.

«Зусім нядаўна сваімі сіламі праз раку Свячанка мы праклалі кладку, якая аб'яднала вёскі Заполле і Свяча, — расказвае старшыня Бешанковіцкага сельвыканкама Мікалай Чашынскі. — Гэта пытанне знаходзілася на кантролі. Жыхарам вёсак без гэтай пераправы даводзілася рабіць немалы круг для таго, каб дабрацца да месца вучобы, працы, да крамы і аддзялення паштовай сувязі. Цяпер мы гэтую праблему вырашылі і будзем трымаць на кантролі падобныя сітуацыі».

Чакаем Дзень Савета,

дзе вырашаюцца вясковыя справы

Праект «Жыццё сяла — вачамі сялян» газеты «Новы дзень» не так даўно завітаў у Верхнеалбянскі сельсавет Жлобінскага раёна, адзін з самых аддаленых ад райцэнтра. Жыхары цікавіліся, калі ў іх пройдзе Дзень Савета. Старшыня раённага Савета дэпутатаў Міхаіл Касюкоў адказаў, што «дадзеная форма працы, калі актыўна вырашаюцца пытанні, звязаныя з жыццезабеспячэннем вяскоўцаў, апраўдала сябе». «І мы будзем працягваць гэтую практыку», — запэўніў ён, паабяцаўшы ўлічыць пажаданні сялян.

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

СОЗДАТЬ БУДУЩЕЕ,

Председатель Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александр ПОПКОВ ответил на вопросы «МС».

— Александр Андреевич, хотелось бы сначала уточнить: что включает в себя понятие «региональная политика»?

— Региональная политика — это комплексное развитие территорий, направленное на решение главных проблем жизнеобеспечения каждого конкретного человека. Она подразумевает и рациональное размещение производительных сил, и выравнивание уровня жизни населения. Региональная политика охватывает все важнейшие отрасли производства, занятость населения, сферу обслуживания, социальную сферу.

Главная цель региональной политики — сглаживание наиболее острых социальных и экономических диспропорций между отдельными регионами страны. В ее основе — развитие экономики как главной составляющей формирования валового регионального продукта. Но мы должны понимать, что регионы априори не могут идти по одному пути, развиваться одинаково. Это зависит и от географического положения, и от сложившейся демографической ситуации, и от уже имеющегося потенциала экономики, и от климатических условий, и от исторических традиций и многого другого.

> Только финансовая устойчивость региона позволяет формировать доходную часть бюджета, которая будет направлена на решение перспективных задач по его развитию. Формирование добавленной стоимости на основе сокращения затрат, снижения импортоемкости — главный оценочный критерий устойчивой работы региона. В этом заключается стратегическая направленность управленческой деятельности.

Несомненно, большая ответственность за развитие региона наравне с исполнительными органами власти лежит и на депутатах всех уровней, так как они утверждают планы социально-экономического развития своих территорий и, естественно, формируют бюджет.

— Какую роль в развитии регионов и в решении актуальных проблем жизнеобеспечения населения играют сегодня Советы депутатов? С одной стороны, это местные органы власти, которые напрямую работают с людьми, с другой – часто можно услышать мнение, что им не хватает полномочий и финансовых возможностей.

— Хочу напомнить, что именно через местные Советы депутатов гражданами осуществляется местное управление и самоуправление. Ведь кто такие депутаты местных Советов? Это граждане, которые проживают или работают на конкретной территории. То есть те, кого волнуют проблемы именно этого конкретного региона. Они не могут быть пассивными наблюдателями происходящих в стране и регионах процессов.

С мнением о том, что депутатам местных Советов не хватает полномочий, категорически не согласен. Кто хочет — ищет возможности, кто не хочет — оправдания. Все полномочия у нас определены Конституцией, Законом «О местном управлении и самоуправлении в Республике Беларусь». Другой вопрос, как грамотно этими полномочиями распорядиться. Может, иногда не хватает знаний, а может, и желания.

Учитывая, что существует проблема некоторой пассивности или нерешительности депутатского корпуса, первое, что пришлось сделать Постоянной комиссии по региональной политике и местному самоуправлению, — провести учебу как раз по этому вопросу в рамках Совета по взаимодействию органов местного самоуправления при Совете Республики. Мы тщательно изучили вопрос «О работе органов местного самоуправления по выполнению Закона Республики Беларусь «О местном управлении и самоуправлении в Республике Беларусь» в свете реализации итоговых документов пятого Всебелорусского народного собрания» на примере Лидского района и Гродненской области. Кстати, председатель Гродненского областного Совета депутатов Игорь Георгиевич Жук и председатель Лидского районного Совета депутатов Инесса Геннадьевна Белуш являются членами Постоянной комиссии по региональной политике и местному самоуправлению.

Представители органов местного самоуправления всех регионов страны ознакомились с опытом работы своих коллег из Гродненской области по созданию новых и очень востребованных производств на базе неиспользованных помещений и обеспечению местных жителей рабочими местами. Мы посетили ИООО «Арвибелагро», ОАО «Лидский ветсанутильзавод», «Минойтовский ремонтный завод» Гродненского унитарного предприятия «Облсельхозтехника», СООО «Бел-Пласт Интернэшнл» и убедились, что при желании современное предприятие можно создать не только в городской местности, но даже в самой неперспективной, как их теперь называют, деревне.

Главные задачи и, я бы даже сказал, руководство к действию для местных Советов депутатов изложены Президентом нашей страны на пятом Всебелорусском собрании. Говоря о региональной политике, глава государства предложил основные усилия сосредоточить на привлечении инвестиций в регионы, которые дадут новые рабочие места, достойную зарплату и налоги в местный бюджет.

Таким образом, основная стратегия действий для местных Советов депутатов находится в плоскости исполнения их основных обязанностей. Эти задачи сформулированы и в Решении Совета по взаимодействию местного самоуправления. Местным Советам депутатов и исполнительным комитетам всех территориальных уровней поручено в этом году провести работу по выполнению параметров социально-экономического развития регионов; принятию сбалансированных бюджетов; созданию новых рабочих мест и новых производств; активизации деятельности по раскрепощению деловой инициативы граждан и развитию малого и среднего бизнеса, вовлечению его в экспортную деятельность, производство продукции с высокой долей добавленной стоимости, а также по привлечению инвестиций и импортозамещению.

У нас есть очень хороший опыт взаимодействия на региональном уровне с Российской Федерацией в рамках Союзного государства. Четвертый Форум регионов Беларуси и России был посвящен сотрудничеству в инновационной сфере и прошел под названием «Векторы интеграционного развития регионов Беларуси и России в сфере высоких технологий, инноваций и информационного общества».

— Действительно, сложившаяся практика проведения форумов регионов Беларуси и России стала уже доброй традицией.

Значимость форумов регионов подтверждает и участие в них Президентов Беларуси и России — Александра Григорьевича Лукашенко и Владимира Владимировича Путина.

Согласитесь, ничто не заменит живое общение! А здесь мы имеем конструктивный диалог законодательной и исполнительной власти, ученых и бизнесменов на одной площадке.

Хочу отметить, что несмотря ни на какие газовые или молочные войны, сотрудничество между регионами Беларуси и России после развала Советского Союза ни на секунду не прекращалось. Мы очень хорошо друг друга понимаем и, что немаловажно, дополняем.

> Результатами четвертого Форума регионов стали соглашения о согласованной промышленной и аграрной политике. По итогам двухсторонних встреч и переговоров было подписано 77 документов о сотрудничестве регионов Беларуси и России, заключено коммерческих экспортных контрактов на сумму, эквивалентную более чем 400 млн долларов США.

В целом должен отметить, что региональное сотрудничество Беларуси с Российской Федерацией – это в определенном смысле залог экономической безопасности Союзного государства. Мы должны сегодня обозначить проблему увеличения ВВП на основе цифровой экономики и IT-технологий, четко определить точки роста, которые будут формировать экономику Союзного государства. В этом плане необходимо выработать современные подходы к образовательным программам, подготовке кадров, гармонизации законодательства и т. д. В этом ключе у нас непочатый край работы.

— Сейчас парламентарии Беларуси в вашем лице наладили тесное сотрудничество с региональными властями Совета Европы. Какой опыт европейских соседей мог бы пригодиться в наших условиях, и что полезного мы могли бы привнести в «копилку демократии» западных государств?

— Совет по взаимодействию органов местного самоуправления при Совете Республики получил статус специально приглашенного наблюдателя в Конгрессе местных и региональных властей Совета Европы. Беларусь в настоящее время является сопредседателем в Комитете региональных и местных органов власти Восточного партнерства. В мае этого года в Минске прошло заседание Бюро CORLEAP.

У нас состоялся конструктивный разговор по актуальным вопросам совершенствования региональной политики стран Восточного партнерства. Глава нашего государства встретился с председателем комитета регионов Маркку Маркулой и послом ЕС в Беларуси Андреа Викторин.

Не так давно я вернулся из Брюсселя, где проходило заседание седьмой ежегодной Конференции местных и региональных властей стран Восточного партнерства. В ходе этого мероприятия из уст европейских коллег прозвучала высокая оценка результативности прошедшего в Минске заседания Бюро CORLEAP.

> Во время дружеских встреч мы объясняем нашим коллегам из Совета Европы, что готовы учиться и брать все самое хорошее, прогрессивное у наших соседей. Но только то, что подходит нам, белорусам. Ведь все народы разные, у каждого свой менталитет, свои стартовые возможности.

Географически мы находимся в самом центре Европы. Так что сам Бог велел нам быть и с Западом, и с Востоком. Президент нашей страны определил политику Беларуси как многовекторную. Никто не оторвет нас от России, но и сказать, что Польша или Литва чуждая нам страна, также нельзя. Долгие годы мы были в составе разных государств, но сохранили свою самоидентичность. Мы молодое государство. Что такое четверть века в рамках истории? Многое у нас уже получается, но к чему-то мы еще стремимся.

Если вспомнить историю, Минск получил самоуправление по Магдебургскому праву дарительной грамотой великого князя литовского и короля польского Александра от 14 марта 1499 года. Город получил право создавать собственный орган самоуправления – магистрат, учреждать городской герб (1591 г.) и знамя города. Так что, учитывая нашу многовековую историю самоуправления, думаю, в вопросе демократии и у нас многому можно поучиться. Но только демократии, а не анархии. К сожалению, в настоящее время эти понятия иногда подменяются.

Кстати, для участия в прошедшем заседании CORLEAP в Минске многие из представителей стран ЕС впервые посетили нашу страну. Хочу отметить с их слов: то, что они увидели у нас, их поразило. Не знаю, какие представления были у наших зарубежных гостей о Беларуси (наверное, только то, что читали в не совсем чистоплотных СМИ). Но уезжали наши коллеги, полностью изменив мнение. Они увидели, как страна развивается, какие у нас трудолюбивые люди. И даже чиновники, несмотря на уверения западных СМИ, всегда открыты к диалогу. У нас не было закрытых тем. Уверен, что дальнейшее сотрудничество в рамках европейских структур должно и будет продолжаться.

Во время ежегодной Конференции региональных и местных властей стран Восточного партнерства в Брюсселе.

В КОТОРОМ ХОТЕЛОСЬ БЫ ЖИТЬ

— Постоянная комиссия, которую вы возглавляете, занимается очень широким кругом вопросов: это и административно-территориальное устройство, и природопользование, и охрана окружающей среды, транспорт, ЖКХ, торговля, аграрная политика. Какие из них пришлось более детально обсуждать в Совете Республики в последнее время?

— В Совете Республики сложилась практика работы не только с поступающими к нам законопроектами, но и проведение мониторинга применения норм законодательства в отдельных отраслях. Так, в Гомельской области Постоянной комиссией в рамках мониторинга рассмотрен вопрос «О минимизации последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС (мониторинг практики применения норм законов Республики Беларусь от 5 января 1998 года «О радиационной безопасности населения» и от 26 мая 2012 года «О правовом режиме территорий, подвергшихся радиоактивному загрязнению в результате катастрофы на Чернобыльской АЭС»).

По итогам этого заседания в Правительство были направлены предложения по совершенствованию законодательства в области радиоактивной безопасности, социальной защиты людей, пострадавших от последствий аварии на Чернобыльской АЭС, в том числе и проживающих на загрязненных территориях. В Совете Министров наши предложения были детально изучены. Было принято решение об их внедрении.

Еще одна актуальная сегодня тема — дальнейшее развитие аграрной отрасли. Я посвятил сельскому хозяйству более 50 лет своей жизни. И, конечно же, эта проблематика мне очень близка. Я знаю, какие проблемы существуют в агропромышленном комплексе на всех уровнях — и в хозяйствах, и в регионах, и в республике в целом. К сожалению, очень часто мы не решаем проблему комплексно, а просто «снимаем болевой синдром». Планируем, что будет, образно говоря, завтра, абсолютно не видя дальнейшей перспективы.

Как раз о путях повышения эффективности работы агропромышленного комплекса республики говорилось на выездном заседании нашей комиссии в Кировском районе Могилевской области. Вместе с представителями местных органов власти, руководством отраслевого министерства, учеными и руководителями хозяйств обсуждали, что мешает сельхозпредприятиям выйти на безубыточную работу. Какие потенциальные возможности есть сегодня у сельчан, чтобы сократить издержки производства? И где найти финансовые возможности для завершения начатой работы по модернизации животноводческой отрасли? Предложения по итогам рассмотрения мы направили в Министерство сельского хозяйства и продовольствия.

> К сожалению, очень часто мы не решаем проблему комплексно, а просто «снимаем болевой синдром». Планируем, что будет, образно говоря, завтра, абсолютно не видя дальнейшей перспективы.

Каждому такому обсуждению предшествует кропотливая работа: анализируется большой объем материала, проводятся консультации с учеными, изучается зарубежный опыт. Мы выносим все наболевшие проблемы на широкое обсуждение. Это становится отправной точкой для формирования того или иного законопроекта. И второе — мы в обязательном порядке информируем соответствующие министерства и ведомства, излагаем нашу позицию и даже подсказываем пути решения тех или иных проблем. Помимо этого, вносим соответствующие предложения в правительство, информируем главу государства.

— Среди парламентариев почему-то принято считать, что если тот или иной закон прошел все этапы обсуждения в Палате представителей, то Совет Республики, как правило, принимает его без проблем. Так ли это?

— Это ошибочное мнение. Правильнее будет сказать, что проекты законов почти всегда возвращаются на доработку.

Приведу примеры. В Совет Республики поступил проект закона «О семеноводстве сельскохозяйственных растений». Предложенный законодательный документ не обеспечивал полноты правового регулирования общественных отношений в семеноводстве всех сельскохозяйственных растений, включая лен, плодовые и овощные культуры, с учетом практики его применения в сельскохозяйственном производстве. Отсутствовал правовой механизм оказания государственной поддержки отрасли, а также производства семян генно-модифицированных культур. Не были отражены вопросы подготовки кадров, механизмов стимулирования экспорта продуктов семеноводческой деятельности, особенностей климатических зон нашей страны, селекции сельскохозяйственных культур. Изучив предложенный проект закона, Совет Республики его не принял. Он был отозван Советом Министров из Палаты представителей. В итоге в доработанном виде он получил название «О селекции и семеноводстве сельскохозяйственных растений», над ним еще продолжают работать специалисты.

Или проект закона «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам питьевого водоснабжения». По мнению нашей комиссии, все предложенные на рассмотрение изменения и дополнения в этот документ в основном были направлены на обеспечение деятельности специализированных организаций водопроводно-канализационного хозяйства. Они не решали главной задачи — совершенствования законодательства в области питьевого водоснабжения, использования, охраны, эксплуатации и содержания в надлежащем состоянии систем питьевого водоснабжения, обеспечения населения питьевой водой и ряд других. Поэтому этот проект также направлен на доработку.

— Работа Совета по взаимодействию органов местного самоуправления, который создан при Совете Республики, – это ведь тоже часть региональной политики? Какую роль он может сыграть в решении наиболее актуальных социально-экономических проблем регионов?

— Совет по взаимодействию органов местного самоуправления играет важную роль в повышении эффективности работы местных органов власти и развитии регионов. Это коллегиальный орган представителей местного самоуправления всех уровней. Вместе с тем это и координационный орган. Он занимается обобщением и внедрением опыта, разработкой единых подходов к той или иной проблеме, доведением до местных органов самоуправления политики государства. Другими словами, Совет по взаимодействию работает «сверху вниз».

Так, в апреле на базе Дзержинского района Минской области состоялся очень жесткий разговор по вопросу работы органов местного управления и самоуправления Минской области по вовлечению в хозяйственный оборот неиспользуемого и не эффективно используемого имущества, находящегося в коммунальной собственности. Представителям министерств пришлось держать ответ перед местными властями. Свои предложения по совершенствованию законодательства в области имущественных отношений мы направили главе государства.

Жилищно-коммунальное хозяйство — это сфера, которая затрагивает интересы всех без исключения. Конечно же, мы не смогли остаться в стороне от этих проблем. В августе на совместном заседании Совета по взаимодействию органов местного самоуправления и Президиума Совета Республики состоялось обсуждение вопроса «О совершенствовании правовых, организационных и экономических основ развития и деятельности жилищно-коммунального хозяйства Республики Беларусь по созданию благоприятных условий жизнеобеспечения населения». Были выработаны конкретные предложения по совершенствованию отрасли ЖКХ. Они направлены в Администрацию Президента Республики Беларусь.

Так что все самые важные вопросы у нас на контроле. Членами Совета по взаимодействию органов местного самоуправления являются представители всех регионов, которые в любой момент могут внести предложения для рассмотрения на Совете тех или иных актуальных проблем общества. В последующем все решения по этим проблемам используются при разработке поправок в соответствующее законодательство.

Конечно же, мы стараемся работать вместе — и Президиум Совета Республики, и Постоянная комиссия по региональной политике и местному самоуправлению, и Совет по взаимодействию органов местного самоуправления. Депутаты местных Советов участвуют в разработке практически всех законопроектов.

— Александр Андреевич, вы много времени проводите в различных регионах Беларуси, регулярно принимаете участие в заседаниях областных и районных исполнительных комитетов. После окончания совещаний общаетесь с населением с помощью прямых телефонных линий и приемов на местах. Что вам дает такое общение? Какие выводы можете сделать по итогам таких выездных мероприятий?

— Каждый раз, общаясь с жителями того или иного региона нашей страны, узнаю много нового и интересного. Такое общение помогает быть в курсе ежедневных забот людей, изучать их проблемы, что называется «из первых уст» и затем использовать этот багаж в своей работе.

> Главное, что хотел бы отметить, говоря о подходах в работе региональных властей, – недостаток четкого видения перспектив развития своего региона. Сейчас, к сожалению, для большинства наших управленцев все переведено в вал. Больше молока, больше мяса. Это какой-то еще советский менталитет. Складывается впечатление, что сегодня плюс и минус валовой продукции к уровню прошлого года — главная забота местной администрации.

Приоритет в работе всех организаций и предприятий региона нужно отдавать экономической составляющей. Нужно думать о том, насколько обеспечивается финансовая устойчивость предприятий и, соответственно, как формируется бюджет, региональный валовый продукт. Практически никто из руководителей местного уровня не задумывается, как снизить затраты производства, за счет чего? Как формировать добавленную стоимость, каким образом уйти от импортозамещения? Как правило, не учитываются и проблемы энергоэффективности. А нужно, чтобы каждое управленческое решение, которое принимается на уровне района, области, было детально просчитано. Должны быть скоординированы и направлены на конкретную цель действия всех специалистов, будь то отдельно взятое предприятие или же целая отрасль.

И сейчас, накануне выборов в местные Советы депутатов, хочу подчеркнуть, что сегодня, как никогда, необходима личная ответственность каждого руководителя, каждого представителя органов власти за успешное развитие своего региона. В качестве кандидатов в депутаты должны прийти очень порядочные и ответственные люди. Они должны быть от народа и с народом, чтобы быть в курсе всех проблем и создавать в нашей стране то будущее, в котором хотелось бы жить не только им, но и нашим детям. На этом и держится успешная региональная политика.

Наталья БИТЕЛЬ.

З НАГОДЫ

У ЖЫЦЦІ ДРОБЯЗЯЎ НЯМА

Такі падыход да працы павінен быць у кожнага дэпутата

Як стаць вядомым у сваёй акрузе і над чым зараз працуюць у парламенце, нашаму карэспандэнту расказаў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Леанід ЦУПРЫК.

— На вашу думку, ці дастаткова сёння ў мясцовых улад паўнамоцтваў і магчымасцяў, каб вырашаць задачы, якія перад імі ставяцца?

— Законам аб мясцовым кіраванні і самакіраванні вызначана кола паўнамоцтваў мясцовых выканаўчых органаў і Саветаў дэпутатаў і парадак іх узаемадзеяння. Вырашэнне сацыяльных, эканамічных, палітычных і культурных пытанняў мясцовага значэння ажыццяўляецца зыходзячы з інтарэсаў насельніцтва і асаблівасцяў развіцця адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак на аснове ўласнай матэрыяльна-фінансавай базы і прыцягнутых сродкаў у рамках адзінага дзяржаўнага механізма. Вялікая роля нашай дзяржавы ў рэсурснай падтрымцы раўнамернага развіцця розных адміністрацыйных тэрыторый рэспублікі.

> Уласна кажучы, і заканадаўства, і формы арганізацыі мясцовага кіравання і самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь нацэлены на тое, каб мясцовая ўлада працавала эфектыўна. У аснове — агульнасць прынцыпаў, наяўнасць агульных мэт дзейнасці, агульная прававая база мясцовага кіравання і самакіравання.

Вырашаючы самыя розныя задачы, кіруючыся нарматыўна-прававымі актамі, органы мясцовага кіравання і самакіравання валодаюць выключнымі ўласнымі паўнамоцтвамі па выданні неабходных кіраўніцкіх актаў, падрыхтоўцы адпаведных рашэнняў і распараджэнняў, прыцягненні неабходных кадравых і матэрыяльных рэсурсаў. Так што ў органаў мясцовага кіравання і самакіравання рэспублікі ёсць усё,

Фота Надзеі БУЖАН.

каб вырашаць задачы, якія стаяць перад імі. Патрэбна эфектыўная работа кадраў, здольных у большай ступені вырашаць пытанні самаразвіцця тэрыторый.

— У якім кірунку неабходна рухацца мясцовай уладзе, каб яе дзейнасць была больш эфектыўнай?

— Калі коратка, то ў кірунку далейшага развіцця народаўладдзя, пашырэння ўдзелу грамадзян у самакіраванні, умацаванні законнасці, зацвярджэнні сацыяльнай справядлівасці і гуманізму. Усё больш узрастаюць патрабаванні да прафесіяналізму кіраўнікоў і супрацоўнікаў органаў мясцовай улады і кіравання, закліканых ажыццяўляць дзяржаўную палітыку на месцах.

Мы, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, працуючы са зваротамі грамадзян, часта вымушаны выпраўляць няякасную работу адказных службовых асоб органаў мясцовага кіравання або галіновых арганізацый. У жыцці людзей няма дробязяў. Для кожнага свая праблема — найважнейшая. Працуючы ў выбарчай акрузе ў кантакце з мясцовымі Саветамі і выканкамамі, мы бачым, наколькі важна своечасова рэагаваць на звароты і аператыўна прымаць меры. Але на станоўчае вырашэнне надзённых пытанняў уплываюць два фактары: рэсурсная база і якасць работы кадраў. Таму лічу адным з найважнейшых напрамкаў развіцця мясцовай улады прымяненне ў сваёй практыцы айчынных навуковых напрацовак у сферы дзяржаўнага кіравання. Напрыклад, навукоўцаў БДУ.

І мая ўласная практыка, і даследаванні навукоўцаў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь прыводзяць да думкі, што працэс рэфармавання органаў дзяржслужбы (а ён практычна не закрануў пярвічны ўзровень мясцовага самакіравання і ў некаторай ступені — базавы ўзровень) мэтазгодна было б дапоўніць канкрэтызацыяй мэтавых функцый і канчатковых вынікаў па кожнай пасадзе на дзяржаўнай службе. Проста наяўнасці кваліфікацыйных характарыстык і фінансавых інструментаў стымулявання дзяржслужачага сёння відавочна недастаткова. Для пачатку, напрыклад, у кантрактах работнікаў трэба вызначыць асноўныя паказчыкі вынікаў, якія неабходна забяспечваць. Трэба несці канкрэтную адказнасць. Будзе асабісты стымул — будзе лепшы агульны вынік працы.

— У наступным годзе пройдуць выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў. Як зараз ідзе падрыхтоўка да гэтай падзеі? Як вы думаеце, ці моцна абновіцца склад дэпутацкага корпуса на мясцовым узроўні?

— Думаю, што новы склад мясцовых Саветаў будзе залежаць ад якасці кандыдатаў у дэпутаты ў выбарчых акругах і іх здольнасці належным чынам весці выбарчую кампанію. Выбары ў мясцовыя Саветы паказваюць, што людзі многіх прэтэндэнтаў вельмі добра ведаюць не толькі па словах, але і па справах. Выбар — за народам! Я, як дэпутат парламента, праводжу і буду праводзіць у сваёй выбарчай акрузе работу па растлумачэнні людзям сутнасці нашай дзяржаўнасці, яе гістарычнай і міжнароднай унікальнасці, неабходнасці яе развіваць, адстойваць і абараняць.

— Якія сёння пытанні стаяць перад камісіяй, якую вы ўзначальваеце?

— Пастаянная камісія па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў займаецца пытаннямі заканадаўства, якія вызначаюць асновы беларускай дзяржаўнасці, функцыянавання мясцовай улады, а таксама шэрагам законапраектаў аб дзяржаўных органах, выбарчай сістэме і інш. Жыццё не стаіць на месцы. Адбываецца грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё, пашыраецца міжнароднае супрацоўніцтва. Натуральна, у Палаце прадстаўнікоў ідзе бесперапынны працэс заканатворчасці, каб законы адпавядалі часу. Так, у Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» з моманту яго прыняцця ў апошняй рэдакцыі ў 2010 годзе ўжо ўнесена 12 дапаўненняў і змяненняў. І зараз у камісіі прапрацоўваюцца дапаўненні і змяненні ў гэты закон у частцы канкрэтызацыі функцый выканкамаў і Саветаў пярвічнага і базавага ўзроўняў.

Развіццё інфармацыйнага грамадства, удасканаленне сродкаў камунікацый на аснове лічбавых тэхналогій стварае ўсё больш перадумоў пераходу на двухзвенавую сістэму мясцовага самакіравання. І гэтае пытанне, і прапановы па выбарчай сістэме, і іншыя грамадска-значныя тэмы мы, дэпутаты, члены камісіі, глыбока і ўсебакова вывучаем, часта запрашаючы спецыялістаў і зацікаўленых асоб. Стараемся прытрымлівацца балансу інтарэсаў пры падрыхтоўцы сваіх заключэнняў і праектаў. Але якім бы ні быў змест праектаў, што разглядаюцца, для нашай камісіі пастаянным прынцыпам з'яўляецца паўната адлюстравання ў іх волі і інтарэсаў народа.

— Часам атрымліваецца, што насельніцтва пэўнай тэрыторыі не знаёмае са сваім дэпутатам. На ваш погляд, чаму так адбываецца і якую ролю тут могуць сыграць СМІ?

— У жыцці людзей дробязяў няма. Калі ты дэпутат, то ведай праблемы людзей, унікай у іх. Даводзь любое пытанне да канчатковага рашэння. Дамагайся станоўчага выніку. І тады людзі ацэняць. І будуць ведаць цябе як чалавека, здольнага дапамагчы і абараніць. А СМІ — першы памочнік дэпутата: кожны вырашае пытанні, але сваімі сродкамі і метадамі.

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

ШТО Ў ПЛАНАХ?

ПРАЦЫ БУДЗЕ ШМАТ

Напярэдадні новага парламенцкага года старшыні пастаянных камісій Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі падзяліліся з «МС» планамі работы на наступную сесію.

Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:

— Камісію чакае шмат працы. Мы плануем разгледзець шэраг законапраектаў: «Аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг)», «Аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі», «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Банкаўскі кодэкс Рэспублікі Беларусь», «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй» і інш. Напрыклад, унясенне змен у апошні звязана з прыняццем пакета нарматыўных прававых актаў, накіраваных на лібералізацыю эканомікі, і з унясеннем змен у грамадзянскі кодэкс. Члены нашай камісіі ўжо актыўна ўключыліся ў работу, і я ўпэўнены, што так будзе і надалей.

Ірына СТАРАВОЙТАВА, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:

— Усяго ў рабоце ў Камісіі знаходзіцца сем законапраектаў: з іх тры ўнесена ў Палату прадстаўнікоў, чатыры прынята ў першым чытанні. Усяго падчас трэцяй сесіі плануем разгледзець тры законапраекты. Сярод іх — «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях патэнтаў на вынаходніцтвы, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры», «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб фізічнай культуры і спорце» і «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ветэранах».

Савет Рэспублікі вызначаны ў якасці дзяржаўнага органа, адказнага за падрыхтоўку законапраекта «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах». Паспяховая і дакладная рэалізацыя нормаў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» сёння разглядаецца як своеасаблівы індыкатар цывілізаванасці любога сучаснага грамадства. У цяперашні час работа над законапраектам практычна завершана. Сабраны і абагульнены прапановы зацікаўленых дзяржаўных органаў, выдавецтваў, выканаўцаў і іншых зацікаўленых. Праведзены пасяджэнні рабочай групы, пагаджальныя і рабочыя нарады. Дадзены законапраект прынцыпова не мяняе існуючыя падыходы да прававога рэгулявання ў сферы інтэлектуальнай уласнасці, ён накіраваны на больш поўнае і сістэмнае прававое рэгуляванне адносін, звязаных з аховай аб'ектаў аўтарскага права і сумежных правоў.

Сяргей РАХМАНАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:

— У рамках трэцяй сесіі шостага склікання Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы трэба будзе разгледзець 16 законапраектаў, у тым ліку 13 ратыфікацый міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Сярод больш чым дзясятка законапраектаў — Закон Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб барацьбе з тэрарызмам». Законапраектам замацоўваецца новы тэрмін «крытычна важныя аб'екты» і даецца яго азначэнне, устанаўліваюцца меры па недапушчэнні актаў тэрарызму на названых аб'ектах. Таксама ўдакладняецца тэрмін «фінансаванне тэрарыстычнай дзейнасці» (прапануецца адносіць да яе ў тым ліку збор сродкаў у мэтах праезду да месца навучання для ўдзелу ў тэрарыстычнай дзейнасці). Уводзіцца абавязак дзяржаўных органаў і арганізацый забяспечваць прыняцце мер па выкананні рэзалюцый Савета Бяспекі ААН у дачыненні да арганізацый і грамадзян, уключаных у пералік асоб, якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай дзейнасці, што будзе садзейнічаць выкананню Рэспублікай Беларусь міжнародных стандартаў у сферы прадухілення легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, і фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці.

Таксама камісія плануе разгледзець Закон Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях абароны». Законапраект накіраваны на ўдасканаленне заканадаўства аб абароне з улікам практыкі прымянення, удасканаленне сістэмы ваеннага планавання і прававога рэгулявання пытанняў абароны, удакладненне задач па выкарыстанні Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ГРАМАДСКАЯ ДУМКА

ШТО ВЫ ДУМАЕЦЕ ПРА ... ?

Ці ведаюць беларусы дэпутатаў мясцовых Саветаў?

Амаль чвэрць насельніцтва нашай краіны лічыць, што меркаванне людзей павінна брацца пад увагу падчас прыняцця таго ці іншага закона. Пра тэндэнцыі, якія назіраюцца сёння ў дзейнасці мясцовай улады, «МС» расказаў Ігар КАТЛЯРОЎ, дырэктар Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, доктар сацыялагічных навук, прафесар.

ІДЭІ АД ДЭПУТАТАЎ

Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі праводзіць даследаванні, якія датычацца мясцовага кіравання і самакіравання, тры гады. Гэта справа была распачата па просьбе Міхаіла Мясніковіча, старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. Апошнія даследаванні праводзіліся ў снежні мінулага года. «Сёння мясцовыя Саветы — гэта адзін з найбольш значных аспектаў развіцця беларускага грамадства, найважнейшы элемент грамадзянскай супольнасці, — лічыць дырэктар інстытута. — Мясцовае самакіраванне — гэта той орган кіравання, які імкнецца ўлічваць інтарэсы жыхароў нават самых аддаленых населеных пунктаў, кожнага горада, сяла, аграгарадка. Яно прыцягвае ў сферу кіравання самыя разнастайныя слаі насельніцтва. Калі прааналізаваць якасны і колькасны склад мясцовых Саветаў дэпутатаў, то відаць, што сярод іх шмат і настаўнікаў, і ўрачоў, і прадаўцоў, і паштальёнаў — тых людзей, якія непасрэдна сутыкаюцца з інтарэсамі працуючых жыхароў рэгіёна кожны дзень».

На думку Ігара Катлярова, за апошнія гады значна палепшылася пазнавальнасць дэпутатаў мясцовых Саветаў, павысілася эфектыўнасць іх работы. Паводле яго асабістага перакананне, гэта заслуга членаў Савета Рэспублікі, яго кіраўніка і, вядома ж, Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. «Але ў пэўнай ступені гэта і наша заслуга. Дэпутаты мясцовых Саветаў і сенатары неаднаразова казалі, што сацыялагічны аналіз меркавання людзей дапамагае ім у далейшай працы. Наша апытанне — гэта перш за ўсё меркаванні народа, людзей, якія непасрэдна сутыкаюцца з работай мясцовых Саветаў».

«Я згадваю час, калі быў дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь XIII склікання. Усе асноўныя законы прапаноўваў прааналізаваць старшыням мясцовых Саветаў дэпутатаў: сельскіх, раённых, абласных, — расказвае навуковец. — Я дакладна памятаю, як адзін з іх — старшыня Вецярэвіцкага сельскага Савета Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці Аляксандр Карашчун — прынёс прапановы па змяненнях у Закон «Аб мясцовым самакіраванні» на трох старонках. Мае калегі, дэпутаты Вярхоўнага Савета, спачатку несур'ёзна паставіліся да гэтых прапаноў, махнулі рукой. А пасля перачыталі ўважліва і зразумелі, што парады карысныя. І шмат якія з гэтых прапаноў былі прыняты потым Вярхоўным Саветам. І такіх прыкладаў шмат. Гэта гаворыць аб тым, што сапраўды неабходна актыўна выкарыстоўваць на ўсіх узроўнях дзяржаўнага кіравання меркаванні дэпутатаў мясцовых Саветаў».

ЁСЦЬ ПРАБЛЕМНЫЯ ПЫТАННІ

Праўда, ёсць і праблемы, якія мясцовым Саветам яшчэ трэба вырашаць. Напрыклад, хутка распачнецца кампанія па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў. «Сёння ж ніхто мэтава «кандыдатаў у кандыдаты» не рыхтуе. Ёсць палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні, якія павінны працаваць з пэўным колам насельніцтва, каб тыя людзі, хто хацеў бы стаць дэпутатам мясцовых Саветаў, мелі магчымасць здзейсніць гэта. А таксама варта праводзіць работу з тымі, хто пакуль жадання не мае, але патэнцыйна змог бы прадстаўляць інтарэсы выбаршчыкаў. З 10 такіх падрыхтаваных «кандыдатаў у кандыдаты» адзін бы быў абраны і прыносіў бы больш карысці грамадству. А праз некалькі гадоў ён зможа стаць дэпутатам Палаты прадстаўнікоў альбо сенатарам і базу будзе мець ужо значна больш глыбокую і грунтоўную. Гэта работа не дзяржавы, а менавіта грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый, якую яны не праводзяць», — лічыць Ігар Катляроў.

На жаль, калі Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі эфектыўна працуюць з дэпутатамі ўсіх узроўняў, то тыя структуры, якія павінны затым павышаць прафесійны ўзровень дэпутатаў, спрацоўваюць не заўжды належным чынам. Так, па словах дырэктара Інстытута сацыялогіі, можна прывесці не адзін прыклад, калі старшыням Саветаў дэпутатаў чытае лекцыі па павышэнні кваліфікацыі той выкладчык, які не мае ўяўлення пра гэтую сферу, ніколі ў ёй не працаваў. І ён вучыць практыкаў, якія кожны дзень з гэтым сутыкаюцца, якія прыехалі, каб даведацца пра найноўшыя тэндэнцыі ў гэтай сферы.

ВЕДАЙ СВАІХ

Тыя даследаванні, якія штогод праводзіць Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі, носяць фундаментальны характар. Жыхарам Беларусі прапаноўваецца адказаць на 60 пытанняў анкеты, сярод якіх ёсць тыя, што задаюцца пастаянна, а таксама сітуацыйныя. Такое апытанне патрабуе шмат выдаткаў як матэрыяльных, так і па часе. «Таму мы прапануем стварыць невялікія структуры, якія пры дапамозе тэлефонных апытанняў будуць імгненна даведвацца пра меркаванне жыхароў таго ці іншага рэгіёна па нейкай невялікай у цэлым, але важнай для гэтай мясцовасці праблеме. Гэта робіцца на працягу дваіх-траіх сутак: інтэрв'юер звязваецца па тэлефоне з людзьмі, задае не больш за пяць пытанняў і адразу атрымлівае адказы», — кажа Ігар Катляроў.

Выходзячы з вынікаў праведзенага даследавання, ён лічыць, што беларускае насельніцтва досыць палітычна актыўнае. Не ўсе, але пэўная частка хоча дапамагчы краіне, дзяржаве, органам мясцовай улады і па магчымасці гэта робіць. «Калі я параўноўваю нас з іншымі дзяржавамі постсавецкай прасторы, то тут на дастаткова высокім узроўні працуюць органы мясцовага самакіравання», — выказаў меркаванне Ігар Катляроў.

Што датычыцца пазнавальнасці дэпутатаў, то амаль палова насельніцтва краіны можа назваць тых, хто прадстаўляе іх інтарэсы ў сельскіх Саветах. І гэтая лічба за апошнія тры гады выросла ў значнай ступені, — раней толькі траціна выбаршчыкаў ведала дэпутатаў гэтага ўзроўню.

ПОГЛЯД ГРАМАДСТВА ЎЛІЧВАЕЦЦА

Ці трэба ўлічваць грамадскую думку падчас распрацоўкі і прыняцця законаў? Станоўча на гэта пытанне адказалі 21,2% рэспандэнтаў, амаль чвэрць насельніцтва. «Значыць, неабходна больш актыўна працаваць з насельніцтвам пры прыняцці законаў», — выказаў меркаванне навуковец.

Па просьбе верхняй палаты беларускага парламента Інстытут сацыялогіі робіць сацыялагічнае суправаджэнне пэўных законаў, г. зн. задаюцца пытанні нашым грамадзянам: якім чынам лепей вырашаць тыя ці іншыя праблемныя пытанні ў розных галінах? «Мы перадаём вынікі такіх даследаванняў у Савет Рэспублікі, дзе іх аналізуюць і прымаюць адпаведныя рашэнні. Увогуле, па ўласным вопыце магу сказаць, што нашы ўлады прыслухоўваюцца да рэкамендацый, якія мы выказваем», — кажа сацыёлаг.

У цэлым насельніцтва мае больш прэтэнзій да выканаўчай улады, чым да заканадаўчай. Людзі ў большасці задаволены тымі нарматыўнымі актамі, якімі рэгламентуецца жыццё ў нашым грамадстве. «Праводзяцца сацыялагічныя апытанні ананімна — каб найбольш дакладна даведацца пра тое, што сапраўды думаюць людзі», — удакладніў Ігар Катляроў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

МЕРКАВАННІ

На якія праблемы ў першую чаргу павінны звяртаць увагу дэпутаты?

Такое пытанне мы задалі выбраннікам народа.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па бюджэце і фінансах Валерый БАРАДЗЕНЯ:

— Дэпутаты павінны займацца заканадаўчай дзейнасцю, усім тым, што прапісана ў Канстытуцыі і законе аб статусе дэпутата. Калі ж казаць больш шырока, то трэба адчуваць, чым жыве краіна, трэба цікавіцца той стратэгіяй развіцця, якая ёсць у дзяржаве. Трэба цікавіцца тым, як любое ведамства расстаўляе прыярытэты. Яшчэ адзін важны аспект: дэпутаты павінны адсочваць, каб у тых ініцыятывах, якія прапануюць міністэрствы, не было лабіравання галіновых інтарэсаў, а быў менавіта агульнадзяржаўны інтарэс.

Я лічу, што сёння нашы дэпутаты спраўляюцца са сваёй работай, прычым вельмі нядрэнна. Трэба пры гэтым памятаць, што дэпутаты бываюць розных узроўняў. У мясцовых Саветах яны павінны быць больш актыўныя, павінны браць на сябе адказнасць у прыняцці тых ці іншых рашэнняў. Бо палітыка нашай дзяржавы такая, што менавіта мясцовыя дэпутаты павінны адыгрываць асноўную ролю, знаходзіцца ў дыялогу з людзьмі і вырашаць іх праблемы.

Старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Сяргей АШМЯНЦАЎ:

— Вядома, першапачатковая задача — работа з насельніцтвам. Кожны дэпутат павінен ведаць праблемы свайго рэгіёна, акругі, каб у любы момант іх можна было данесці да ведама кіраўніцтва ў вобласці. Калі ёсць праблема, калі яна хвалюе людзей, то яе трэба тэрмінова вырашаць. Мне здаецца, у гэтым і заключаецца галоўная задача дэпутата. Ён павінен жыць праблемамі людзей, ён можа на іх паўплываць. Не магу сказаць, што дэпутаты не спраўляюцца са сваёй працай. Гэта адказныя і аўтарытэтныя людзі, многія з якіх з'яўляюцца кіраўнікамі прадпрыемстваў, — і людзі іх сапраўды ведаюць. І ў меру сваёй працоўнай дзейнасці дэпутаты дапамагаюць. Больш за тое, я лічу, што абавязкова павінна быць зваротная сувязь. Бо праблемы бываюць розныя: нешта можна зрабіць хутка, але частку праблем вырашыць адразу немагчыма. Таму і трэба мець зносіны, гаварыць аб праблеме, трымаць людзей у курсе.

Намеснік старшыні Асіповіцкага раённага Савета дэпутатаў Людміла ДОЎГАЯ:

— У першую чаргу трэба звярнуць увагу на праблемныя пытанні нашых грамадзян. А яны, як звычайна, датычацца жыллёва-камунальнай гаспадаркі, добраўпарадкавання тэрыторый. Трэба адысці ад бюракратызацыі, выехаць на аб'ект, паглядзець, а іншы раз — проста пагутарыць. Бывае, што тэлефануюць пенсіянеры, якім проста не хапае зносін, трэба з імі пагаварыць. Ці часта да мяне прыходзяць з жыццёвымі праблемамі? Па-рознаму. Бывае, нават суседзі паміж сабой сварацца, трэба паслухаць. Тлумачым і тонкасці заканадаўчых актаў. У асноўным народ хоча зносін. Я лічу, што дэпутаты спраўляюцца са сваімі абавязкамі, тым больш што ўсе нашы тэлефоны — і нават мабільныя — размешчаны на сайце выканкама, у газетах. Любы чалавек можа патэлефанаваць і выказаць усё, што яму хочацца.

Старшыня Цярэшкавіцкага сельскага выканаўчага камітэта Гомельскага раёна Яўген ІГНАЦЬЕЎ:

— Па-першае, дэпутат павінен даносіць да людзей тое, пра што гавораць на сесіях. Гэта значыць, інфармаваць пра самае важнае на бягучы момант. Акрамя таго, дэпутаты павінны дапамагаць з добраўпарадкаваннем тэрыторый — умоўна, калі дзесьці не пакасілі траву, трэба звярнуцца ў адпаведныя органы. Таксама яны павінны сачыць за асвятленнем і іншымі бытавымі праблемамі. Увогуле, усё гэта жыццёвыя пытанні. Калі пытаюцца, у якіх аспектах дэпутатам трэба палепшыць сваю дзейнасць, то тут я заўсёды кажу так: улада там, дзе ёсць грошы. Калі рашэнне патрабуе вялікіх сродкаў, тут складана казаць аб хуткім станоўчым выніку.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

ЭКАНОМІКА

Першае і адзінае ў краіне

На Міншчыне наладжана новая вытворчасць

У Старых Дарогах, што на Міншчыне, адбылося адкрыццё беларуска-ўкраінскага прадпрыемства — сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «БЕЛТРЫБА». Гэта першы і адзіны ў краіне завод па вытворчасці тармазных калодак і накладак.

Першапачаткова тут планавалася выпускаць дэталі толькі для абслугоўвання кар'ерных самазвалаў «БелАЗ». Аднак заснавальнікі вырашылі расшырыць наменклатуру прадукцыі: наладзіць вытворчасць тармазных калодак для Мінскага метрапалітэна і Мінскага трактарнага завода, а ў першым паўгоддзі 2018-га — для Беларускага завода легкавых аўтамабіляў «БелДжы». Для рэалізацыі праекта ў цэху пастаўлена дадатковае абсталяванне, павялічаны сумы інвестыцый, падоўжаны тэрмін дзеяння інвестыцыйнага дагавора.

Па стане на 15 верасня гэтага года ўкладанні ў стварэнне вытворчасці тармазных калодак склалі 1 800 000 долараў ЗША.

Пробная партыя прадукцыі прайшла выпрабаванні, сфарміраваны заказ да канца года для ААТ «БелАЗ» у памеры 500 тыс. рублёў. Акрамя таго, у жніўні 2017-га прынята рашэнне на свабодных плошчах прадпрыемства арганізаваць выпуск цеплавых экранаў для аўтамабіляў «БелДжы».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

СМАЧНА ЕСЦІ!

Каму смажанку па-вясковаму з грыбамі?

Пятнаццаты Тыдзень беларускай кухні праходзіць у Мінску з 25 верасня па 1 кастрычніка, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.

Удзел у акцыі прымаюць 80 кавярняў і рэстаранаў. Гасцям прапаноўваюць шэсць страў нацыянальнай кухні, якія карысталіся асаблівым попытам падчас папярэдніх акцый. Гэта курыны рулет з маласольнымі агуркамі — 4,5 рубля, гарбузовы суп з курыцай і грэнкамі — 3,5 рубля, пячыста з падліўкай і печанай гароднінай — 9,5 рубля, смажанка па-вясковаму з грыбамі — 8,5 рубля, хвост тварожны з мёдам — 3,5 рубля, морс журавінавы — 1 рубель. Традыцыйны прынцып Тыдня беларускай кухні — адзіная рэцэптура і кошт незалежна ад тыпу і класа аб'екта грамадскага харчавання.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МС»

ДЗЯКУЙ, СТАРАСТА!

Цяпер жыхароў вуліцы Краснадарскай ніякае надвор'е не палохае

Новыя слупы і зручная дарога на гэтай вуліцы паявіліся не без дапамогі «МС». Нагадаем, што за апошнія некалькі гадоў газета неаднаразова звярталася да праблем жыхароў аднаго з прыватных сектараў Магілёва. Пасля апошняй публікацыі ў ліпені гэтага года, дзе гаворка ішла пра нездавальняючы стан дарогі на азначанай вуліцы, рэдакцыя атрымала некалькі лістоў з Магілёўскага гарвыканкама за подпісам намесніка старшыні Сяргея Дзядовіча, дзе расказваецца, якія былі прынятыя меры. У прыватнасці, гаворыцца там, «зроблены работы па прафіляванні вуліцы з падсыпкай асфальтагранулятам». Карэспандэнт пацікавілася ў старасты мікразоны Віталя Гардзеева, ці ёсць прэтэнзіі да якасці работ.

Вуліцу цяпер не пазнаць.

Па дарозе на вуліцу Краснадарскую староста з гонарам дэманструе новыя бетонныя слупы. «Памятаеце, калі вы ўпершыню да нас прыязджалі, тут стаялі драўляныя, пазамінулага стагоддзя, а зараз сучасныя, — радуецца ён. — Без дапамогі газеты мы, магчыма, і па сённяшні дзень жылі б са старымі асвятляльнымі апорамі. А так іх цалкам замянілі ва ўсім нашым мікрараёне Чапаеўка...»

На жаль, з дарогамі сітуацыя больш складаная. Але вуліцу Краснадарскую сапраўды не пазнаць. Апошнім разам дарога нагадвала пральную дошку з-за калдобін, а цяпер тут ляжыць хоць і не вельмі роўны, але ж асфальт. «Ужо не трэба баяцца, што пойдуць дажджы, і праезную частку зноў размые», — задаволены суразмоўнік. Нагадаем, што праблемы пачаліся пасля таго, як адна прыватная фірма ўзялася пракласці на Краснадарскай каналізацыю, але пасля гэтага так і не прывяла дарогу ў парадак. Жыхарам прыйшлося некалькі гадоў шукаць праўды. У лісце з гарвыканкама пазначана, што за нядбайнае стаўленне да сваіх абавязкаў па кантролі за выкананнем у тэрмін зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб вызвалены ад пасады намеснік генеральнага дырэктара Магілёўскага ўпраўлення камунальных прадпрыемстваў (УКП). Віталь Гардзееў упэўнены, што, калі б не падтрымка газеты, асфальт на Краснадарскай маглі б і не пакласці так хутка.

— Зрабілі цудоўна, асфальт тут наогул з'явіўся ўпершыню, — далучаецца да размовы тутэйшы жыхар Мікалай Кудравец. — Але да таго, як тут зрабілі каналізацыю, пытанняў па дарозе ў нас не ўзнікала, зямля была ўтрамбаваная. А вось пасля будаўніцтва на паверхні застаўся ўвесь бруд. Таму людзі і скардзіліся.

— Асабліва падчас дажджоў было дрэнна, хоць гвалт крычы, — падтрымлівае сына Ларыса Кудравец. — Надзявалі пакеты на боты і ішлі. Наш староста малайчына, клапоціцца пра ўвесь раён. Дамагаецца ўсяго. Мы таксама тэлефанавалі. У нас, наогул, каля дома было горш чым дзе. А зараз прыгожа. Цяпер траву стрыжом, кусцікі, дрэўцы даглядаем, — хочацца, каб быў парадак.

Депутаты Могилевского городского Совета

У асобнай папцы, дзе Віталь Гардзееў захоўвае ўсю дзелавую перапіску па мікразоне, ёсць і кароценькая інфармацыя пра кожнага дэпутата гарадскога і раённага Саветаў.

— Калі параўноўваць з тым, што было, дык гэта неба і зямля, — адзначае яшчэ адна жыхарка вуліцы Краснадарскай Валянціна Лусцянкова. — Лужы былі такія, што людзі прайсці не маглі. Абыходзілі па суседняй вуліцы. Цяпер нас ніякае надвор'е не пужае.

Людміла Жукава таксама прызнаецца, што раней было жахліва, асабліва калі ішоў дождж. Нават гумавыя боты насіла з сабой. «Вы малайцы. А наш староста — сумленны чалавек».

Ад сябе асабіста і жыхароў мікразоны Віталь Гардзееў папрасіў перадаць словы падзякі дырэктару Магілёўскага дарожна-маставога прадпрыемства Сяргею Мікалаевічу Маславу і начальніку сектара па справаводстве гэтага ж прадпрыемства Вользе Мікалаеўне Зінкевіч. «Як бы мы там з імі ні дыскутавалі, праца зроблена, і вялікі ім за гэта дзякуй, — адзначыў ён. — А яшчэ дзякуй супрацоўнікам гарадскіх электрычных сетак, якія зрабілі нам асвятленне».

У асобнай папцы, дзе Віталь Гардзееў захоўвае ўсю дзелавую перапіску па мікразоне, ёсць і кароценькая інфармацыя пра кожнага дэпутата гарадскога і раённага Саветаў. «Вось гэта былы дырэктар Гарсвятла Аляксандр Пашкевіч, — паказвае ён выразку з газеты. — Вельмі добры дэпутат. Адзін з найлепшых у горадзе. Ніколі не адмаўляецца дапамагчы».

Але з новымі слупамі і дарогай на вуліцы Краснадарскай праблемы на Чапаеўцы не заканчваюцца. Жыхары спадзяюцца, што калі-небудзь апранецца ў асфальт і іх цэнтральная вуліца Валгаградская. Трэба адзначыць, што прэтэнзіі абгрунтаваныя. Дарога бярэ пачатак ад адной з галоўных вуліц Магілёва — Першамайскай — і цягнецца амаль на кіламетр па прыватным сектары. У старасты захоўваецца адказ з УКП, што «на добраўпарадкаванне вуліцы пайшло каля ста тон асфальтагранулята». Мы разам прайшлі амаль усю вуліцу, але не атрымалі пацвярджэння, што так яно і было.

— Гэта проста адпіска, — лічыць Віталь Гардзееў. — Нельга так рабіць. Гэта ж прыватны сектар. Вось мы ідзём з вамі па вуліцы, нікога вакол няма, але ж нас бачаць. І гэтыя самазвалы з тонамі асфальту бачылі б. Толькі іх тут не было.

Барыс Лусцянкоў, які вырас на Чапаеўцы, можа з зайздроснай дакладнасцю ўзнавіць галоўныя этапы ў жыцці гэтай вуліцы. Кажа, што ў 60-я гады, калі яму было 10, тут паклалі брукаванку, потым перакапалі пад водаправод, затым «вялі» тэлефонны кабель, праз нейкі час — каналізацыю. Таму дарога цяпер і нагадвае мазаіку, — там кавалак бруку, тут зямлі, а дзе былі ямкі — асфальту.

— Вось па Краснадарскай людзі гвалт паднялі — яе і зрабілі. А Валгаградскую хоць і абяцаюць давесці да розуму, але ж тэрміны пакуль кожны раз адкладваюцца, — уздыхае няўрымслівы староста. І запэўнівае, што не намераны проста так здавацца.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. **Нумар падпісаны ў 19.30 26 верасня 2017 года.**